# У БЕЛАРУСІ З 1 ВЕРАСНЯ СПРАШЧАЮЦЦА ПРАЦЭДУРЫ АДАБРАННЯ ПУСТУЮЧАГА І СТАРОГА ЖЫЛЛЯ Ў ВЁСЦЫ

**Адпаведны ўказ № 100 «Аб мерах па ўдасканаленні ўліку і скарачэнні колькасці пустуючых і старых дамоў у сельскай мясцовасці» Аляксандр Лукашэнка падпісаў 23 лютага.**

Гэты дакумент уяўляе сабой новую рэдакцыю ўказа ад 3 лютага 2006 года № 70 «Аб мерах па ўпарадкаванні ўліку і скарачэнні колькасці пустуючых і старых дамоў з гаспадарчымі і іншымі пабудовамі ў сельскай мясцовасці».

Яго выданне абумоўлена складанасцямі, выяўленымі пры прымяненні на практыцы норм указа № 70, і неабходнасцю спрашчэння працэдур адабрання безгаспадарча ўтрымліваемых (пустуючых і старых) жылых дамоў у сельскай мясцовасці, а таксама актывізацыі жыллёвага будаўніцтва ў сельскіх населеных пунктах.

Указам захаваны існуючыя падыходы да спынення правоў уласнасці на пустуючыя і старыя жылыя дамы выключна ў судовым парадку. Пры гэтым удакладняюцца прававыя падставы і парадак аднясення жылых дамоў да ліку пустуючых або старых, ліквідуюцца асобныя працэдуры, якія не маюць істотнага значэння і не ўплываюць на прыняцце рашэнняў аб накіраванні такіх дамоў ва ўласнасць адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, іх зносе або аднаўленні для выкарыстання па прызначэнні.

Згодна з указам да ліку пустуючых могуць быць аднесены жылыя дамы, размешчаныя ў сельскай мясцовасці, у адносінах да якіх на 1 студзеня кожнага года ёсць дакладныя звесткі аб тым, што на працягу апошніх трох гадоў запар асобы, якія маюць права карыстання імі, пражываюць у іх у сукупнасці менш як адзін месяц у год і ў адносінах да якіх не прадстаўлены пісьмовыя паведамленні аб намеры выкарыстоўваць іх для пражывання.

Пад старымі дамамі маюцца на ўвазе размешчаныя ў сельскай мясцовасці дамы, прызнаныя не адпавядаючымі санітарным і тэхнічным патрабаванням або непрыгоднымі для пражывання, у адносінах да якіх на 1 студзеня кожнага каляндарнага года ёсць дакладныя звесткі аб тым, што гэтыя дамы ўтрымліваюцца безгаспадарча, асобы, якія маюць права карыстання імі, на працягу апошняга года не пражываюць у іх і не прымаюць мер для аднаўлення гэтых дамоў для выкарыстання па прызначэнні.

Пры гэтым указам на мясцовыя выканкамы ўскладаюцца абавязкі па вышуку ўласніка пустуючага дома, асоба і (або) месца жыхарства якога невядомы (у тым ліку з прыцягненнем органаў унутраных спраў), і па апавяшчэнні яго аб магчымым маючым адбыцца прызнанні такога жылога дома безгаспадарным і выніках такога прызнання. Пры паведамленні ўласніка выканкаму аб намеры выкарыстоўваць пустуючы дом для пражывання такі дом не ўключаецца ў рэгістр пустуючых дамоў і мерапрыемствы па прызнанні яго безгаспадарным не праводзяцца.

У цэлым рэалізацыя норм указа павінна садзейнічаць актывізацыі работы мясцовых выканкамаў па выяўленні безгаспадарча ўтрымліваемых (пустуючых і старых) жылых дамоў у сельскай мясцовасці, скарачэнні іх колькасці і добраўпарадкаванні сельскіх населеных пунктаў.

Указ уступае ў сілу з 1 верасня 2012 года.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# ДТСААФ — 85!

**ДТСААФ выхавала мільёны патрыётаў, здольных і гатовых з гонарам адстойваць інтарэсы краіны ў працы, воінскай службе і паўсядзённым жыцці. Аб гэтым гаворыцца ў віншаванні Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з нагоды 85-годдзя Рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Добраахвотнае таварыства садзейнічання арміі, авіяцыі і флоту Рэспублікі Беларусь» (ДТСААФ), якое зачытаў на ўрачыстым сходзе ветэранаў і членаў ДТСААФ дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Беларусі Леанід Мальцаў, перадае БЕЛТА.**

У віншаванні кіраўнік дзяржавы адзначыў, што створанае 28 лютага 1927 года абароннае таварыства ўнесла вялікі ўклад у падрыхтоўку соцень тысяч спецыялістаў, якія змагаліся ў радах абаронцаў Радзімы ў гады Вялікай Айчыннай вайны. «Сёння беларускае абароннае таварыства па праву з'яўляецца вядучым цэнтрам падрыхтоўкі дапрызыўнай моладзі да службы ва Узброеных Сілах, адыгрывае важную ролю ў развіцці і ўдасканаленні авіяцыйных, тэхнічных і ваенна-прыкладных відаў спорту, у прапагандзе здаровага ладу жыцця. Сучасная дзейнасць ДТСААФ адпавядае нашым нацыянальным інтарэсам і заслужана карыстаецца прызнаннем і падтрымкай насельніцтва», — адзначаецца ў віншаванні. Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць у тым, што ДТСААФ і ў далейшым будзе аддана служыць свайму народу, паспяхова выконваючы важную місію выхавання сапраўдных грамадзян і патрыётаў Беларусі.

Леанід Мальцаў таксама адзначыў, што з першых дзён утварэння ДТСААФ паспяхова вырашала задачы падрыхтоўкі насельніцтва да абароны Айчыны, развіцця авіяцыйных і тэхнічных відаў спорту, абучэння дапрызыўнай моладзі ваенным спецыяльнасцям. Паводле яго слоў, сёння міжнародная абстаноўка застаецца няпростай і супярэчлівай, зніжаецца эфектыўнасць механізмаў забеспячэння міжнароднай бяспекі, працягваецца трансфармацыя ваенна-блокавых адносін. Не спыняюцца ваенныя канфлікты. «У гэтых умовах важнейшай роляй ДТСААФ працягвае заставацца выхаванне сапраўдных патрыётаў сваёй краіны, масавае захапленне моладзі развіццём авіяцыйных і тэхнічных відаў спорту», — адзначыў Леанід Мальцаў.

Суб'ектыўнае меркаванне

# СЁЛЕТА ПРАВІЛЫ ПАСТУПЛЕННЯ Ў ВНУ НЕ ЗМЕНЯЦЦА

**НАВІНА пра тое, што Правілы прыёму ў ВНУ і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы вырашана не змяняць, прагучала ўчора як гром сярод яснага неба. Пра неабходнасць сур'ёзнай карэкціроўкі дзейнага парадку адбору прэтэндэнтаў на студэнцкі білет было заяўлена адразу пасля завяршэння мінулагодняй прыёмнай кампаніі. І яшчэ восенню была падрыхтавана новая рэдакцыя правіл прыёму з улікам усіх прапаноў, якія паступілі ад Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзеннем уступных іспытаў у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах.**

Першапачаткова планавалася, што новыя правілы будуць зацверджаныя яшчэ да канца 2011 года. Аднак час ішоў, а пра з'яўленне новых правіл чутно не было, хоць грамадская думка да іх з'яўлення і, у прыватнасці да адмены льгот, была падрыхтаваная... І вось учора першы намеснік міністра адукацыі Аляксандр Жук, які ўдзельнічаў у выніковай калегіі Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама, заявіў, што ніякіх змяненняў у 2012 годзе не будзе: і асобны конкурс для гарадскіх і сельскіх абітурыентаў, і льготы пры паступленні для пэўных катэгорый абітурыентаў у гэтым годзе вырашана захаваць.

Шчыра кажучы, абсалютна незразумела, чым была выклікана такая рэзкая змена курсу, паколькі і члены дзяржаўнай камісіі, і прадстаўнікі галоўнага адукацыйнага ведамства, і кіраўнікі ВНУ аднолькава ацэньвалі сітуацыю: ільготы, што прадстаўляліся абітурыентам, часта ішлі ім не на карысць, залічаныя на льготных умовах не заўсёды спраўляліся з адукацыйнай праграмай і гэта парушала адзін з галоўных прынцыпаў — аб'ектыўнасць і справядлівасць адбору прэтэндэнтаў на студэнцкі білет. Нярэдка прэферэнцыі, што даваліся абітурыентам з сельскай мясцовасці, фактычна гарантавалі ім пазаконкурснае паступленне, прычым на вельмі прэстыжныя спецыяльнасці. Гэта значыць, што калі на пэўную спецыяльнасць падаваў заяўку ўсяго адзін абітурыент-вясковец, то незалежна ад яго сумы балаў ён аўтаматычна залічваўся ў кола студэнтаў. У БДУ такая сітуацыя назіралася летась пры паступленні на 15 спецыяльнасцяў, у тым ліку і на такую звышпрэстыжную спецыяльнасць, як «міжнароднае права».

А сітуацыя з залічэннем абітурыентаў-ільготнікаў і ўвогуле даходзіла да абсурду. Так, у БДУ на спецыяльнасць «псіхалогія» быў залічаны летась ільготнік з кола дзяцей, што засталіся без бацькоўскай апекі, які набраў усяго 108 балаў. Пры гэтым не змог стаць студэнтам абітурыент, які набраў 296 балаў — амаль утрая больш! На спецыяльнасць «паліталогія» ў БДУ па-за конкурсам быў залічаны абітурыент, які набраў 112 балаў, а абітурыент, які меў 337 балаў, застаўся за бортам. Аналагічныя сітуацыі назіраліся штогод таксама ў БНТУ, Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце, БДЭУ і ў іншых універсітэтах.

Яшчэ адно важнае новаўвядзенне, якога ўсе чакалі, — гэта павышэнне «вагі» профільнай дысцыпліны пры падліку прахаднога бала пры паступленні на прыродазнаўча-навуковыя спецыяльнасці ВНУ (матэматыка, фізіка, хімія, біялогія). З дапамогай каэфіцыента «2» для профільнай дысцыпліны збіраліся падтрымаць найбольш матываваных маладых людзей, якія набіраюць высокія балы па профільных прадметах, але не праходзяць па агульным конкурсе. Так, як гэта было, напрыклад, у БДУ на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, дзе пры паступленні на дзённую бюджэтную форму навучання абітурыент, які набраў 84 балы са 100 магчымых па абодвух прадметах (матэматыка і фізіка) на змог прайсці па конкурсе. Затое былі залічаны абітурыенты, якія набралі па профільных прадметах значна меншыя балы, але мелі пэўную перавагу перад канкурэнтамі за кошт сертыфіката ЦТ па дзяржаўнай мове і сярэдняга бала атэстата. А на фізічным факультэце ў залічаных на дзённую бюджэтную форму навучання ўдзельная «вага» двух профільных прадметаў (матэматыкі і фізікі) у агульнай суме набраных балаў складала толькі 37 працэнтаў, у той час як дзяржаўная мова і сярэдні бал дакумента аб адукацыі заняў асноўную долю — 63 працэнты. Абсалютна незразумела, каго адбіралі: на фізфак будучых філолагаў ці людзей з матэматычным складам розуму?

Відаць па ўсім, з усіх рацыянальных прапаноў па ўдасканаленні парадку прыёму ў ВНУ пакінуць толькі адну — будзе зноў уведзены «ніжні парог», які не дазволіць удзельнічаць у конкурсе абітурыентам з вельмі нізкімі баламі. Справа ў тым, што пасля адмены ў 2008 годзе «ніжняй мяжы» ў ВНУ змаглі паступаць абсалютна ўсе ахвотныя, якія набралі на цэнтралізаваным тэсціраванні 1 бал і больш. Таму ў спісах залічаных пачалі знаходзіць сябе і тыя, хто хадзіў у школе ў «круглых двоечніках». Ну хіба можна было раней стаць студэнтам ВНУ, маючы сярэдні бал атэстата 3,2 па дзесяцібальнай шкале і «двойкі» па ўсіх асноўных школьных дысцыплінах (фізіцы, матэматыцы, хіміі і мове)? А цяпер можна... Праўда, дзе будзе праходзіць ніжняя мяжа, стане вядома пазней. І калі яе агучаць (да пачатку правядзення ЦТ або пасля праверкі ўсіх работ яго ўдзельнікаў), застаецца пакуль што тайнай...

Трэба таксама нагадаць, што існаванне льгот для пэўных катэгорый абітурыентаў называлася адной з прычын, па якіх тармозіцца ўкараненне ў краіне электроннай сістэмы залічэння абітурыентаў. Усеагульны пераход на новую сістэму быў запланаваны на 2014 год, пасля абкаткі яе ў 2013 годзе на групе медыцынскіх ВНУ. У распрацоўку аўтаматызаванай сістэмы залічэння былі ўкладзены вялізныя сродкі. Няўжо дарэмна?

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Прамая лінія

# Каму банк дае льготныя крэдыты?


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**На пытанні чытачоў падчас «прамой лініі» адказаў дырэктар дэпартамента крэдытавання насельніцтва ААТ «ААБ Беларусбанк» Віктар АГЕЕЎ.**

*(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 24 лютага.)*

☎ ***— У нашай сям'і двое непаўналетніх дзяцей, аднак у жыллёвую чаргу мы сталі тады, калі нам было больш як 31 год. На які крэдыт мы можам разлічваць пры будаўніцтве жылля?***

**Алена Паўлаўна, *г. Салігорск.***

— У якім месцы вы збіраецеся будавацца?

***— У сваім горадзе, які даволі вялікі. Насельніцтва Салігорска — больш чым 100 тысяч чалавек.***

— Як я зразумеў, пад катэгорыю маладой сям'і ці пад нейкую іншую катэгорыю льготнікаў па Указе № 13 вы не падпадаеце. У гэтым выпадку права на льготны крэдыт вы не маеце. Каб атрымаць больш дакладную інфармацыю вам трэба звярнуцца ў мясцовы выканкам, які ажыццяўляе фарміраванне спісаў на льготны крэдыт.

***— Тады які крэдыт мы можам атрымаць пад будаўніцтва жылля?***

— Для грамадзян з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў Беларусбанк прадастаўляе доўгатэрміновыя крэдыты пад 31% гадавых.

☎ ***— Я працую ў структуры МНС, дзе стаю ў чарзе маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. На якіх умовах нам, ваеннаслужачым, будуць даваць ільготныя крэдыты?***

**Спадарыня Святлана, *г. Мінск.***

— У новым Указе № 13 асобным радком прадугледжваецца такая катэгорыя льготнікаў, як ваеннаслужачыя. Умовы прадастаўлення крэдытаў такім грамадзянам ажыццяўляюцца на падставе Указа № 195. Аднак сёння гэты ўказ яшчэ не мае канкрэтных умоў прадастаўлення крэдытаў. Цяпер распрацоўшчыкам гэтага дакумента дадзена адпаведнае заданне — да 1 сакавіка вызначыць канкрэтныя тэрміны і ўмовы прадастаўлення льготных крэдытаў ваеннаслужачым.

***— Калі майму мужу прапануюць будавацца ад яго працы ў ЖБСК, то яму дадуць ільготны крэдыт? Ён не працуе ў сістэме МНС.***

— Зразумела, што ваш муж не можа разлічваць на льготны крэдыт згодна з Указам № 195, бо ён не з'яўляецца ваеннаслужачым. Такі крэдыт можна афармляць толькі на вас.

***— А ці існуюць нейкія абмежаванні па заробках пры выдачы льготных крэдытаў згодна з Указам № 195?***

— На гэтае пытанне я вам не адкажу, бо Указ № 195 яшчэ толькі распрацоўваецца. Адно адзначу, што ў старой рэдакцыі гэтага ўказа такі крытэрый, як малазабяспечанасць крэдытаатрымальніка і членаў яго сям'і, не ўлічваўся.

**Карэспандэнт «Звязды»:**

***— У рэдакцыю паступіла шмат пытанняў, якія датычацца фінансавай дапамогі дзяржавы шматдзетным сем'ям. Што тут змянілася?***

— Сёння заканадаўствам прадугледжана, што сем'і, якія маюць траіх непаўналетніх дзяцей, маюць права на пагашэнне дзяржавай запазычанасці па льготным крэдыце ў памеры 75 працэнтаў ад аб'ёму запазычанасці. Сем'і, якія маюць і выхоўваюць чатырох і больш дзяцей, маюць права на пагашэнне дзяржавай запазычанасці па льготным крэдыце ў поўным памеры.

***— Пры будаўніцтве жылля ўзнікаюць розныя сітуацыі. Вядома, што, згодна з Указам № 13, ільготнікам Беларусбанк крэдытуе 20 квадратных метраў на чалавека (у Мінску — 15 квадратных метраў, а для шматдзетных і ў сталіцы — 20 кв. метраў). Аднак бываюць выпадкі, калі сем'і будуюць кватэры большай плошчы, чым гэта прадугледжана нарматывам па льготным крэдытаванні. Уласных грошай для фінансавання такіх дадатковых метраў не заўсёды хапае. На якіх умовах у вашым банку можна дакрэдытавацца ў гэтых выпадках?***

— Стаўка рэфінансавання цяпер у краіне складае 43 працэнты. Таму крэдыты пад будаўніцтва жылля ў камерцыйных банках сёння даволі дарагія. Аднак Беларусбанк з'яўляецца такой фінансавай установай, якая заўсёды ажыццяўляла сацыяльную палітыку пры дапамозе грамадзянам, якія будуюць жыллё. Таму для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, у нашым банку можна дакрэдытавацца пад 31% гадавых. Для шматдзетных сем'яў у гэтым выпадку існуе фіксаваная працэнтная стаўка ў памеры 22% гадавых.

***— Згодна з новым Указам № 13, усе льготныя крэдыты (акрамя крэдытаў для шматдзетных сем'яў) «прывязаны» да стаўкі рэфінансавання. Крыху раней стаўка рэфінансавання была 45%, зараз яна складае ўжо 43%. Як у гэтым выпадку будзе мяняцца працэнт па льготным крэдыце?***

— Указам прадугледжана, што памер стаўкі рэфінансавання ўлічваецца на дату ўключэння ў спісы на льготны крэдыт. Яшчэ раз удакладню, што не на дату заключэння крэдытнага дагавора з банкам, а на дату ўключэння грамадзяніна ў спісы на льготны крэдыт. Напрыклад, калі сёння было прынята рашэнне выканкама аб уключэнні той ці іншай сям'і ў спісы на льготнае крэдытаванне, то пры вызначэнні ўмоў ільготнага крэдытавання будзе выкарыстоўвацца стаўка рэфінансавання ў памеры 43%. Тыя грамадзяне, па якіх рашэнні аб уключэнні ў спісы на льготны крэдыт былі прыняты сёлета да 15 лютага, атрымаюць умовы льготнага крэдытавання прапарцыянальна (10%, 20% і 50%) ад стаўкі рэфінансавання памерам 45%. Адсюль і былі раней вызначаны лічбы працэнтаў ільготнага крэдытавання для розных катэгорый ільготнікаў у памеры 4,5%, 9% і 22,5% гадавых.

Пасля таго, як грамадзянін быў уключаны ў спісы на льготны крэдыт, а потым ён звернецца па крэдыт у банк, — на гэта можа спатрэбіцца месяц ці нават больш. За гэты час стаўка рэфінансавання можа змяніцца. Аднак для нашага грамадзяніна са спіса гэтая стаўка застаецца ўжо нязменнай.

***— Атрымліваецца, працэнтныя стаўкі льготнага крэдытавання застануцца нязменнымі на ўвесь тэрмін крэдытавання, нягледзячы на тое, што памер стаўкі рэфінансавання за гэты час можа змяніцца. Днямі кіраўнікі ўрада прагназавалі магчымае памяншэнне стаўкі рэфінансавання на працягу года амаль напалову...***

— Ва Указе № 13 не прадугледжана памяншэнне ці павелічэнне працэнтных ставак па ўжо выдадзеных крэдытах. Разам з тым, трэба ўлічваць той факт, што гэты дакумент толькі пачынае дзейнічаць. Магчыма, што ў сувязі з пэўнымі нюансамі, якія ўзнікнуць пры рэалізацыі гэтага ўказа, будзе дадзена адпаведнае даручэнне Мінбудархітэктуры аб правядзенні ўсебаковага аналізу ўсіх момантаў, у тым ліку і па працэнтных стаўках. Не выключаю, што пэўныя нормы новага ўказа тады могуць нават крыху карэктавацца.

***— Пытанне не зусім па тэме. Пэўная колькасць нашых чытачоў брала крэдыты некалькі гадоў таму ў Беларусбанку пад жыллёвае будаўніцтва ў якасці чаргавікоў на агульных падставах пад 13—17% гадавых. У тых дагаворах існуе адзін пункт, па якім банк мае права змяняць працэнтныя стаўкі па крэдытах...***

— Сапраўды, заканадаўствам і дагаворамі прадугледжана такая магчымасць. Наш банк, менавіта ўлічваючы гэтую сацыяльную накіраванасць, на гэта не пайшоў. Больш за тое, наш банк першым з іншых фінансавых устаноў знізіў стаўкі па раней выдадзеных крэдытах у замежнай валюце.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Парламенцкі дзённік

# ЗАЙЗДРОСНАЯ ПАСЛЯДОЎНАСЦЬ

*Беларуская дэлегацыя ўзяла ўдзел у зімовым пасяджэнні ПА АБСЕ*

**ПАРЛАМЕНТАРЫІ краін-удзельніц АБСЕ днямі сабраліся ў Вене. Там 23-24 лютага праходзіла зімовае пасяджэнне Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе. Удзельнічала ў ім і беларуская дэлегацыя на чале з намеснікам старшыні Палаты прадстаўнікоў Віктарам Гумінскім.**

23 лютага прадстаўнікі Нацыянальнага сходу Беларусі ўзялі актыўны ўдзел у рабоце трох профільных камітэтаў Асамблеі і ў іх сумесным пасяджэнні. В.Гумінскі выступіў падчас спецыяльных абмеркаванняў судовай і пенітэнцыярнай сістэм у рэгіёне АБСЕ. Віцэ-спікер заявіў, што забеспячэнне рэальнага выканання правоў чалавека немагчымае без незалежнай судовай сістэмы, якая абапіраецца на сур'ёзную заканадаўчую базу, а таксама без іншых інструментаў, адным з якіх з'яўляецца пенітэнцыярная сістэма. Ён акцэнтаваў, што Беларусь выбудоўвае гэту заканадаўчую аснову, зыходзячы з прынцыпаў міжнароднага права, і паслядоўна яе ўдасканальвае.

Адказваючы на каментар аднаго з дакладчыкаў па сітуацыі ў Беларусі, В.Гумінскі падкрэсліў, што рэзалюцыя, прынятая ПА АБСЕ летась у Бялградзе, не вылучаецца аб'ектыўнасцю, збалансаванасцю ацэнак і па многіх пазіцыях вызначаецца яўнай інфармацыйнай няпэўнасцю.

На спецыяльным абмеркаванні «Бягучы эканамічны крызіс у Еўропе» выступіла па тэме фінансавых рынкаў другі ўдзельнік беларускай дэлегацыі — старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Ніна Мазай.

Учора адбылося спецыяльнае абмеркаванне тэмы «Будучыня кантролю над звычайнымі ўзброенымі сіламі ў зоне АБСЕ», а таксама пасяджэнне Пастаяннага камітэта ПА АБСЕ на ўзроўні кіраўнікоў парламенцкіх дэлегацый і сумеснае пасяджэнне трох агульных камітэтаў.

**Зоя ВАРАНЦОВА.**


ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

# «ЛіМ» чыталі Колас і Купала!..

## 26 ЛЮТАГА 1932 ГОДА: КРЫХУ ГІСТОРЫІ...

Газета «Літаратура і мастацтва» напачатку выходзіла як орган Федэрацыі аб'яднанняў савецкіх пісьменнікаў БССР (з чэрвеня 1932 — Аргкамітэта ССП БССР) і Галоўмастацтва БССР. Выдавалася на чатырох палосах, тры разы на месяц. Кошт нумара — 5 капеек, падпісная цана на год — 1 рубель 80 капеек. Адказным рэдактарам газеты быў Х. Дунец. Сярод членаў рэдкалегіі: А. Александровіч, В. Вольскі, І. Гурскі, М. Лынькоў, І. Харык, К. Чорны.

Пра тое, якое важнае месца ў грамадстве адводзілася новай беларускай газеце, сведчыць вітальнае слова сакратара ЦК КП(б)Б Шаранговіча, якім адкрываецца першы нумар «ЛіМа»: «ЦК упэўнены, што газэта будзе сапраўдным баявым органам у змаганьні за генэральную лінію партыі, за ленінскую нацыянальную палітыку, за гегемонію пролетарскай літаратуры БССР...».

Невыпадковая ў сувязі з гэтым і назва перадавога артыкула дэбютнага нумара: «Змагацца за магнітабуды літаратуры і мастацтва», дзе адзначаецца: «Выхадам газэты «Літаратура і мастацтва» пролетарская і савецкая літаратура і мастацтва набываюць яшчэ адну вострую зброю арганізацыі і выхаваньня мас, арганізацыі і выхаваньня кадраў літаратуры і мастацтва пабальшавіцку... Трэба гэтую зброю максімальна выкарыстаць, мобілізаваць увагу пралетарскай грамадзкасьці вокал газеты, стварыць кадры карэспандэнтаў з рабочых, калгаснікаў і працоўных наогул, прыцягнуць да актыўнага ўдзелу ў газеце кадры савецкіх і пролетарскіх пісьменнікаў, а таксама работнікаў мастацтва, літаратуразнаўцаў і крытыкаў-ленінцаў. Газета павінна быць зброяй барацьбы за генэральную лінію партыі ў галіне літаратуры і мастацтва...».

Побач — некалькі абвестак, адна з іх надзвычай паказальная:

«28-га лютага 1932 года рэдакцыя газеты «Літаратура і мастацтва» разам з БелАПП склікае Нараду працаўнікоў літаратуры і мастацтва па пытаннях:

Удзел пісьменнікаў і працаўнікоў мастацтва ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

Асвятленне ходу творчай дыскусіі ў літаратуры і мастацтве.

Запрашаюцца: пісьменнікі, мастакі, працаўнікі тэатру, драматургіі, крытыкі БелАПП, крытычна-творчае аб'яднанне ВПІ, рабочыя ўдарнікі і члены завадскіх літаратурных гурткоў. Нарада адбудзецца роўна а 7-й гадзіне ў памяшканні Дома Пісьменніка».

Загалоўкі публікацый першага нумара даюць магчымасць уявіць зместавую накіраванасць тагачаснага культурнага жыцця: «Усе сілы на абарону краіны Саветаў, супраць пагрозы новай імперыялістычнай вайны», «Адкрыты ліст Бернарду Шоў і Стэфану Цвэйгу», «Літаратурны фронт Заходняй Беларусі», «Праверыць пяро і вінтоўку», «За ваяўнічую партыйнасць у пралетарскай літаратуры і мастацтве», «За стварэнне сапраўднага вобразу бальшавіка», «За бальшавіцкую якасць мастацкай кнігі», «Тэатральнае мастацтва павінна стаць сапраўднай зброяй змагання за генеральную лінію партыі»...

## ГАЗЕТА ЯК ХРОСНАЯ МАЦІ...

«ЛіМ» — своеасаблівая творчая лабараторыя, праз якую прайшлі ці не ўсе беларускія празаікі, паэты, крытыкі. Гэта хросная маці беларускіх літаратараў, дый увогуле — нацыянальнай літаратуры.

За гады існавання газета «надала крылы», выправіла ў літаратуру многіх таленавітых паэтаў і пісьменнікаў. На яе старонках упершыню апублікаваны многія творы Я. Купалы, Я. Коласа, П. Броўкі, А. Куляшова, І. Шамякіна, Я. Брыля, І. Мележа, І. Чыгрынава, І. Пташнікава, Я. Сіпакова, Я. Янішчыц, А. Пісьмянковаа, Л. Рублеўскай, многіх іншых таленавітых паэтаў і празаікаў. Надрукавацца ў «ЛіМе» заўсёды лічылася гонарам.

...З першых дзён існавання газеты Янка Купала быў актыўным яе аўтарам і дарадцам, асабіста быў знаёмы з многімі супрацоўнікамі рэдакцыі, часта наведваўся ў рэдакцыю, цікавіўся справамі, прыносіў свае новыя творы, якія газета ахвотна друкавала. У газеце «Літаратура і мастацтва» ўпершыню былі апублікаваны такія творы Янкі Купалы, як паэма «Тарасова доля» (да 125-годдзя з дня нараджэння ўкраінскага Кабзара), верш-прысвячэнне «Якубу Коласу», творы ляўкоўскага цыкла і іншае.

Дзяржава належным чынам адзначыла працу не аднаго пакалення журналістаў-лімаўцаў: у 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў.

## КЛАСІКІ СВЕДЧАЦЬ...

Кандрат Крапіва ў святочным нумары , прысвечаным 50-годдзю «ЛіМа» (1982), напісаў:

«Цяпер сярод нас ужо мала тых, каму давялося бачыць першыя нумары «ЛіМа» і чытаць у іх свае творы. Але калі пагартаць старонкі нашай газеты за ўсе пяць дзесяцігоддзяў, дык яны нам раскажуць аб тым, як ад этапа да этапа, усё вышэй і вышэй узнімаліся ў сваім развіцці беларускія літаратура і мастацтва, якія праблемы і на якім узроўні вырашалі нашы пісьменнікі і мастакі. Знойдзем мы на гэтых старонках і тое, што не вытрымала выпрабаванне часам, у выніку чаго нам прыйшлося зрабіць пераацэнку некаторых каштоўнасцей...»

У артыкуле «З нецярпеннем чакаю газету...» Пімен Панчанка адзначае:

«Пяцьдзесят гадоў. Цэлае жыццё!

На маёй памяці на старонках нашай любімай газеты друкавалі вершы і артыкулы Янка Купала і Якуб Колас. Яе рэдактарам адразу пасля вайны быў Аркадзь Куляшоў. Тут некалькі гадоў працаваў я і мае таварышы, цяпер вядомыя пісьменнікі.

У нашай газеты, як і ў кожнага чалавека, было складанае, часам нялёгкае жыццё з яго ўзлётамі і спадамі, удачамі і няўдачамі.

Калі я азіраюся на даваенныя часы, успамінаю, з якой нецярплівасцю мы чакалі кожны нумар «ЛіМа». Было так радасна, калі цябе ўспаміналі ў нейкім артыкуле ці аглядзе. І ўжо зусім быў шчаслівы, калі прыводзілі твае ўдалыя радкі і строфы...».

## ДЗЕНЬ СЁННЯШНІ...

Віктар Гардзей калісьці напісаў прысвечаны газеце верш «Высока ляці праз небасхіл!» Ёсць у ім вось такія радкі:

*На паліцы легла — не прапала,*
*Бо жыццё не спішаш у архіў.*
*«ЛіМ» чыталі Колас і Купала,*
*«ЛіМ» чыталі між лясоў і ніў.*

За 80 гадоў у «ЛіМе» змянілася не адно пакаленне таленавітых журналістаў. Сённяшнія лімаўцы, як і іх папярэднікі, рупліва дбаюць пра развіццё айчыннай літаратуры і ўвогуле мастацкай творчасці. Іх праца скіравана ў тым ліку на тое, каб істотна ажывіць літаратурнае жыццё краіны, забяспечыць плённае развіццё нацыянальнай культуры.

У віншавальным слове з нагоды юбілею Міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Алег Праляскоўскі адзначыў, што ад самага першага выпуску газета «Літаратура і мастацтва» цвёрда трымалася традыцый высокага мастацкага слова, адказнасці перад сваім чытачом. «Сённяшні «ЛіМ» аб'ядноўвае творчую інтэлігенцыю краіны, спрыяе рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры і літаратуры, з'яўляецца адкрытай пляцоўкай для творчых дыскусій, аўтарытэтнай школай айчыннага прыгожага пісьменства. Упэўнены, што і надалей творчы калектыў выдання будзе трымацца абранага курсу служэння праўдзе жыцця, захавае вернасць свайму прафесійнаму і грамадзянскаму абавязку».

На ўчарашняй прэс-канферэнцыі старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец падкрэсліў: «Мы ў пастаянным кантакце са штотыднёвікам. Разам працуем, каб наша літаратура мацавалася і развівалася. Мы адчуваем сваю адказнасць за публікацыі штотыднёвіка, бывае, і крытыкуем, а часам бачым і сваю віну — што не заўсёды даём у «ЛіМ» добрыя матэрыялы». Мікалай Іванавіч выказаў і прапанову: магчыма, у перспектыве варта было б змяніць фармат «ЛіМа»?..

Саюз пісьменнікаў зрабіў штотыднёвіку выдатны падарунак (камп'ютар і прынтар). Ганаровай граматай СПБ узнагароджана Таццяна Сівец, якая ўзначальвае штотыднёвік са снежня мінулага года, а таксама супрацоўнікі рэдакцыі і пазаштатныя аўтары.

**Таццяна ПАДАЛЯК.**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

**ОАО «ЦЕНТРОЭНЕРГОМОНТАЖ» ВНОСИТ ИЗМЕНЕНИЯ В ПОВЕСТКУ ДНЯ ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ,** *опубликованную в газете «Звязда» 31 января 2012 года,* **дополнив текст пунктом 13 следующего содержания: «О крупной сделке ОАО «Центроэнергомонтаж».**

УНП 100092167 *Совет директоров*

*Уважаемые акционеры ОАО «Мостоотряд № 88»*
**27 марта 2012 года**
**СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**
**ОАО «МОСТООТРЯД № 88»**
**Собрание пройдет по адресу:**
**г. Минск, ул. Промышленная, д. 16, третий этаж, актовый зал.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2011 году и об основных направлениях деятельности Общества в 2012 году.
2. О работе наблюдательного совета в 2011 году. Оценка деятельности Директора Общества наблюдательным советом. Отзыв наблюдательного совета о годовом балансе Общества.
3. Утверждение аудиторской проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год, заключение ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности Общества за 2011 год.
4. Утверждение годового отчета и баланса Общества за 2011 год.
5. Утверждение порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении предприятия за 2011 год. О выплате дивидендов за 2011 год.
6. Утверждение плана распределения прибыли, остающейся в распоряжении предприятия на 2012 год. Периодичность выплаты дивидендов за 2011 год.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. О вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по указанному выше адресу в рабочие дни **с 15 марта по 26 марта 2012 г. с 13 до 17 часов** у председателя наблюдательного совета, а в день собрания – в помещении, где оно будет проводиться – в актовом зале в здании управления на третьем этаже.

Регистрация участников собрания с **15.00** до **15.25** по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания – 27 марта 2012 года в 15.30**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию **на 14 марта 2012 года.**

**Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.**

УНП 100299744 *Наблюдательный совет*

**ОАО «БЕЛТОРГСТРОЙ»**
**сообщает, что 30 марта 2012 года в 14.00**
**СОСТОИТСЯ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**
**по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 31.**
**Регистрация — с 13.00. При себе иметь паспорт.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

- Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год и основных направлениях развития на 2012 год.
- Отчет о работе наблюдательного совета.
- Отчет ревизионной комиссии.
- Утверждение годового отчета и бухгалтерского баланса за 2011 год.
- О распределении чистой прибыли и выплате дивидендов за 2011 год.
- Направления использования чистой прибыли на 2012 год.
- Выборы членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
- Утверждение условий материального вознаграждения членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
- О передаче полномочий общего собрания по вопросам подпунктов 27.13—27.17 пункта 28 главы 6 Устава в компетенцию наблюдательного совета сроком на один год.
- О внесении изменений в Устав Общества.
- Об увеличении уставного фонда Общества.

УНН 100633428

ТЕХНОБАНК

Открытое акционерное общество
**220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44**

**УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ТЕХНОБАНК»!**
**Настоящим извещаем о проведении очередного (годового) Общего Собрания акционеров ОАО «Технобанк» в очной форме**
*согласно протоколу Наблюдательного Совета ОАО «Технобанк» от 24.02.2012 № 17.*

**Дата проведения: 28 марта 2012 года.**

**Место проведения (адрес):**
**г. Минск, пр-т Победителей, д. 31, 2-й этаж**
**(конференц-зал ОАО «Гостиница Планета»).**

Регистрация лиц, имеющих право на участие в общем собрании: с 11.00 до 12.00 по месту проведения собрания при предъявлении документов, подтверждающих их личность (паспорт) и полномочия представителей акционеров (документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица; доверенность).

**Время проведения заседания: с 12.00 до 15.00.**

**Повестка дня Общего Собрания акционеров:**

1. Об утверждении годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибыли и убытках, отчета об изменении капитала и отчета о движении денежных средств за 2011 год.
2. О распределении прибыли ОАО «Технобанк» за 2011 год.
3. О нормативах распределения прибыли ОАО «Технобанк» на 2012 год.
4. Об увеличении уставного фонда ОАО «Технобанк».
5. О внесении изменений в Устав ОАО «Технобанк».
6. О выкупе ОАО «Технобанк» акций собственного выпуска по требованию акционеров ОАО «Технобанк».
7. О выплате дивидендов за 2011 год.
8. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.
9. Об избрании членов Наблюдательного Совета ОАО «Технобанк».
10. Об избрании членов Ревизионной комиссии ОАО «Технобанк».

Для ознакомления с информацией (документами), подлежащей предоставлению при подготовке к проведению собрания, обращаться в ОАО «Технобанк» по адресу:
**г. Минск, ул. Кропоткина, 44, телефон (8 017) 237 43 80.**

*Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 11 от 31.05.2010, УНП 100706562*

**ОБЪЯВЛЕНИЕ**
**Наблюдательный совет ОАО «Мехколонна № 93»**
**ставит в известность, что 30.03.2012 в 11.00**
**в помещении ОАО «Мехколонна № 93» (3 этаж)**
**по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 13**
**СОСТОИТСЯ ОТЧЕТНО-ВЫБОРНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ПО РЕЗУЛЬТАТАМ РАБОТЫ ЗА 2011 ГОД.**

УНН 100003019

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

1. Отчет о работе Наблюдательного совета ОАО «Мехколонна № 93» за 2011 г.
*Докладчик — Председатель Наблюдательного совета Михальков Н.Я.*
2. Отчет дирекции о производственно-финансовой деятельности по использованию сметы ФЭС за 2011 год и утверждение плана социально-экономического развития и сметы ФЭС общества «Мехколонна № 93» по направлению на 2012 год.
*Докладчик — директор Сосновский В.М.*
3. Отчет Ревизионной комиссии ОАО «Мехколонна № 93» о работе за 2011 год и утверждение акта аудиторской проверки финансовой деятельности ОАО «Мехколонна № 93» за 2011 год.
*Докладчик — Афанасьев А.П.*
4. Утверждение годового баланса ОАО «Мехколонна № 93» за 2011 год.
*Докладчик — Гл. бухгалтер.*
5. Определение порядка выплаты дивидендов на 2012 г.
*Докладчик — Сосновский В.М.*
6. Вопрос об отчуждении имущества ОАО «Мехколонна № 93».
*Докладчик — Михальков Н.Я.*
7. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии по ОАО «Мехколонна № 93».
*Докладчик — Сосновский В.М.*
8. Определение размера вознаграждения членам Наблюдательного совета, Ревизионной комиссии.
*Докладчик — Сосновский В.М.*

**Председатель Наблюдательного совета Н.Я. Михальков**

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.02.2012 г. (для б/н разлікаў) | | | |
|---|---|---|---|
| ▼1 долар ЗША | 8 110,00 | 1 чэшская крона | 434,32 |
| ▼1 еўра | 10 840,00 | 1 польскі злоты | 2 607,97 |
| 1 латвійскі лат | 15 551,29 | ▼1 расійскі рубель | 275,50 |
| 1 літоўскі літ | 3 144,14 | 1 украінская грыўня | 1 012,42 |

| Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ | |
|---|---|
| USD | 29,4490 |
| 10 UAH | 36,7768 |
| 10000 BYR | 35,7825 |
| EUR | 39,3645 |

Фотарэпартаж

# Дом без міласэрнасці — як чалавек без душы





**ГЭТУЮ ўстанову на Любаншчыне называюць не інакш як домам міласэрнасці. Сем гадоў мінула з часу стварэння бальніцы сястрынскага догляду на базе колішняй участковай у вёсцы Сосны. Адрэзак часу параўнальна невялікі, каб падводзіць вынікі і пералічваць дасягненні. Ды ці да месца будзе гэткае падсумоўванне? Але відавочна тое, і гэта паказала само жыццё, што рашэнне раённых улад на адкрыццё гэтай сацыяльнай установы было і правільным, і своечасовым.**

Вядома, «за прыгожыя вочы» не раздаюцца ні добрыя водгукі, ні станоўчыя адзнакі. У тым ліку і за прыгожыя фасады, і за ўнутраныя аддзелкі, якімі б «еўрапейскімі» яны ні былі. Ніхто дзякуй не скажа, калі ў доме адсутнічае галоўнае — міласэрнасць, душа такіх вось установ. Толькі гэта не пра бальніцу ў Соснах.

25 чалавек, як правіла, адзінокіх і хворых, знайшлі сабе прытулак у сценах Сасноўскай бальніцы № 2 сястрынскага догляду. Хто часова, а хто і... назаўсёды, да апошніх дзён. Калі казаць дакладна — ім знайшлі гэты прытулак. Каго прывезлі родныя дзеці, каго — далёкая радня, іншых — суседзі альбо вясковыя сацыяльныя работнікі ўладкавалі. Тут, як кажуць, шляхі Гасподнія...

Дваццаць пяць чужых душ становяцца блізкімі па волі лёсу. Не, не сябрамі па няшчасці. Хутчэй суседзямі, калі зусім незнаёмыя засяляюцца ў адным доме. Суседства гэтае не з лёгкіх, не заўсёды і не адразу яно даецца і ўсталёўваецца. Людзі ж розныя — па ўзросце, стане здароўя, сацыяльным паходжанні, залежнасці ад шкодных звычак, ступені псіхічных адхіленняў. Важна навучыцца цярпець і прымаць адно аднаго такімі, якія ёсць. Але прымаць іх такімі павінен найперш персанал медустановы. І хоць гэта для яго з'яўляецца працай, менавіта міласэрнасць робіцца асноўнай рысай усіх і заўсёдных узаемаадносін.

— Кожнага з нашых пацыентаў мы шкадуем. Ужо за тое, што ў чалавека сумны вынік жыцця — казённы дом. Неістотна, кім гэты чалавек быў раней. Бо ніхто не павінен быць пакінутым. Хто яму паспачувае, як не мы? — перапытвае загадчыца гэтай бальніцы Таццяна Мігун. — Як правіла, усе яны сацыяльна неабароненыя, бездапаможныя, як дзеці, і ў дадатак — хворыя.

У адным з пакояў на ложку ў абдымку сядзіць немаладая пара. Заўсёды звяртаеш увагу на гэткія праявы ў адносінах людзей, а тут — тым больш. Мяне папярэджваюць, што гэта муж і жонка, колішнія жыхары Любані. Міхаіл — былы экскаватаршчык, Вольга працавала бухгалтарам. Ды вось бяда напаткала іх — цяжка захварэлі. Яго паралізавала, у яе — псіханеўралагічны дыягназ. А ў іх дзяцей не было іншага выйсця. Як-ніяк тут і клопат, і догляд адпаведны. Вольга і Міхаіл жывуць у розных пакоях, але ўдзень жонка прыходзіць да роднага чалавека. Бачыць гэта без суперажывання немагчыма. Па-свойму яны шчаслівыя. Таму што разам. Астатнія насельнікі ўстановы — самотныя.

— Мы ні ў якім разе не асуджаем тых людзей, якія догляд сваіх бацькоў перакладаюць на дзяржаву. Гэта іх права і выбар. Гэткая наша рэальнасць, толькі не ў лепшых яе праявах. Але кожны дзень пераконваемся: у якім бы ўзросце ні быў чалавек, нішто не можа замяніць яму родных, і тым больш дзяцей. Як бы мы ні намагаліся ствараць душэўныя і камфортныя ўмовы, людзі чакаюць сустрэчы з блізкімі, іх усё роўна цягне дадому, — дзеліцца назіраннямі загадчыца Таццяна Мігун. — Штодня бачым вочы гэтых людзей, робімся міжвольнымі сведкамі іх размоў, душэўных хваляванняў, перамен настрою. Міласэрнасць — гэта яшчэ і жаданне зразумець чужога, уменне яго суцешыць. Быць побач.

Цёплы і ўтульны дом стаў агульным для колішніх жывёлаводаў і паляводаў, рабочых будоўлі, школьных настаўнікаў, былых ваенных, медработнікаў... Але тут не дзеляць па мінулым сацыяльным статусе і прафесіі, па памеры пенсіі. Дом аднолькава родны для ўсіх. А вось падыход да кожнага жыхара — сапраўды індывідуальны. Іх нават пацыентамі не называюць. Каб не пакрыўдзіць. Ні старажылаў, ні тых, хто толькі што паступіў.

Апошнім у вялікую сям'ю міласэрнага дома прынялі дзеда Аляксандра. Якраз роўна месяц таму. 82-гадовы «новенькі» ўжо асвоіўся, хутка прывык да гарачых ваннаў, чыстай бялізны, дыетычнай ежы. Паставая сястра Наталля Анікеева кажа, што колішні ваенны любіць, каб яго паслухалі, пагаварылі з ім. І яна, заходзячы ў пакой праверыць ціск, дае дзядулю магчымасць выгаварыцца, пажаліцца на несправядлівасці свету, панаракаць на лёс. Інакш як даведаешся пра дарогу, якая прыводзіць сюды людзей на сконе жыцця?

Каб трапіць у гэтую ўстанову, трэба яшчэ дачакацца месца ў ёй. Чарга. Бо тут на добрым узроўні медыцынскі догляд, чатырохразовае харчаванне, адпачынак каля тэлевізара. Магчымасць атрымліваць газеты і кнігі (прыходзіць бібліятэкар), глядзець канцэрты мясцовай самадзейнасці. Пасля леташняга капітальнага рамонту «павесялеў» вонкавы выгляд, значна пацяплела ў пакоях. Нават у нядаўнія маразы тэмпература ў памяшканнях не зніжалася ніжэй за 24 градусы.

Ды ўсё ж галоўную тэмпературу і спрыяльны мікраклімат сасноўскага прыстанку для нямоглых ствараюць яе медыцынскі, гаспадарскі і тэхнічны персанал. У большасці тут даўнія работнікі. Медыцынскія сёстры Ніна Дзічкоўская і Любоў Гудвіловіч, Наталля Анікеева працуюць з часу скančэння медвучылішчаў. З дня адкрыцця ўстановы працуюць санітаркі Наталля Цагельнік і Вольга Маскальчук, кухары Алена Статкевіч і Ніна Лукашова, раздатчыца Кацярына Махнач, сястра-гаспадыня Любоў Валасоўская, фельчар Людміла Скрыпская.

А ў загадчыцы Таццяны Мігун медыцынскі стаж на адным месцы сягае наогул за дваццаць гадоў. Ад яе, маці траіх дзяцей, і пачуў гэтае: «Любіце і даглядайце сваіх матуль, як і яны некалі не шкадавалі сябе і дзяліліся з дзецьмі апошнім!»

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**





Наваколле і мы

# У ПАГОНІ ЗА «ДАЛІКАТЭСАМ»

**Ужо некалькі гадоў запар гродзенскае ТАА «Фірма «Мока» займаецца нарыхтоўкай вінаградных слімакоў. Вось і сёлета фірма звярнулася ў шэраг раёнаў Брэстчыны па дазвол на збор малюскаў.**



Вінаградны слімак з майго саду.

Калі не ўлічваць асобных гурманаў, то наша насельніцтва цікавасці да слімакоў не праяўляе, а ў ежу іх, найперш, ужываюць у Кітаі, Францыі, Германіі... Большая частка нарыхтаваных у Беларусі малюскаў ідзе на экспарт.

У нас вінаградныя слімакі спрадвеку існавалі самі па сабе, і мясцоваму люду ў галаву не магло прыйсці, што іх можна есці. Мне давялося неяк паспытаць гэты далікатэс у кітайскім рэстаране ў Германіі, і калі б не запіў чырвоным віном, то не здолеў бы праглынуць. Але за мяжой слімакоў ядуць з вялікім задавальненнем.

У Баранавічах перад чыгуначным вакзалам з вясны працуе прыёмны пункт, куды здаюць вінаградных слімакоў, якіх збіраюць па закінутых старых парках і сядзібах. Пасля такога «палявання» слімакоў ужо не знайсці «днём з агнём». А самае сумнае, што слімакоў з года ў год збіраюць без выбару. На тым жа прыёмным пункце ў скрынях з дарослымі малюскамі даводзілася бачыць і шмат дробных — да 1 см, хоць па закона памерам меней за 2,5 см збіраць забаронена.

За дзейнасцю ТАА «Фірма «Мока» павінны сачыць супрацоўнікі інспекцыі аховы прыродных рэсурсаў і навакольнага асяроддзя. Пры гэтым гродзенская фірма мае разгалінаваную сетку нарыхтоўчых пунктаў у розных рэгіёнах краіны і абавязана таксама рассяляць слімакоў і прытрымлівацца выдзеленай на іх збор квоты. Напрыклад, у 2012 годзе «фірме «Мока» ў Бярозаўскім раёне дазволена сабраць 2,7 тоны вінаградных слімакоў, а нарыхтоўваць іх можна будзе на працягу пяці гадоў.

Можна не сумнявацца, што за гэты перыяд у раёне колькасць гэтых малюскаў значна зменшыцца, бо асаблівая ўвага будзе надавацца нарыхтоўцы, а не развядзенню слімакоў. Трэба адзначыць, што збіраюць малюскаў вельмі часта людзі, давяраць сумленню якіх не выпадае. Ды і пракантраляваць, колькі прадукцыі сабрана ў тым ці іншым раёне, даволі складана.

Лепш было б, каб вінаградных слімакоў разводзілі на спецыяльных фермах, а не выграбалі з прыроднага асяроддзя. Але прыватнік імкнецца ісці шляхам найменшага супраціўлення — ёсць магчымасць ухапіць рубель, дык чаму б гэта не зрабіць? У выніку выйгрыш маюць некалькі чалавек, а страты нясе прырода, усе мы.

Тэхналогія развядзення слімакоў на Захадзе існуе даўно, застаецца толькі пераняць вопыт. Калі ж тыя, хто робіць на слімаках бізнэс, не пойдзе гэтым шляхам, ці не давядзецца ў хуткім часе разводзіць слімакоў па дзяржаўнай праграме і засяляць імі нашы паркі?

**Сымон СВІСТУНОВІЧ, фота аўтара.**

# ЗНЯВОЛЕНЫЯ ТАКСАМА ПЛАЧУЦЬ,
## або Інтэрв'ю з турэмным святаром

**Аляксандр (імя зменена па этычных меркаваннях) трапіў у турму праз гарэлку. Як гэта нярэдка здараецца, пасля працяглай папойкі нешта не падзялілі з сабутэльнікам. За мацюкамі і кулакамі ў ход пайшоў нож... Год таму ўжо 50-гадовы мужчына выйшаў на волю. Аднавяскоўцы дзівяцца: быццам бы падмянілі чалавека! Калі раней піў не прасыхаючы, то зараз і кроплі ў рот не бярэ. Уладкаваўся на працу, наведвае царкву. Няўжо турма можа так кардынальна змяніць чалавека?.. Адказ на гэта і іншыя пытанні шукаем разам з настаяцелем храма Святой Жыванaчальнай Троіцы ў Барысаве Георгіем ЦЮХЛОВЫМ, бацькам 8 дзяцей. Айцец Георгій служыць турэмным святаром ужо 14 гадоў. У 1998 указам Мітрапаліта Філарэта быў прызначаны на гэтую пасаду пры СІЗА №8 у Жодзіне. З 2010 года ён — духоўнік папраўчай калоніі строгага рэжыму №14 у Навасадах.**



### «Спачатку зняволеныя мяне правяралі, злівалі «дэзу» і чакалі, усплыве яна дзе ці не»

**— Айцец Георгій, раскажыце, калі ласка, як вы сталі турэмным святаром?**

— Старэйшы турэмны святар айцец Аляксей Шынкевіч 14 гадоў таму з'язджаў у Канаду на паслухмянства. Менавіта ён мне і прапанаваў працаваць у СІЗА №8 замест сябе.

**— І вы адразу згадзіліся?**

— Так, вы ведаеце, не супраціўляўся. Неяк у мяне з самага пачатку не было асуджэння да зняволеных. Я бачу ў іх у першую чаргу людзей, якія недзе спатыкнуліся: некаму пашанцавала больш, некаму — менш. Таму кантактаваць з імі мне лёгка.

**— А як зняволеныя да вас ставяцца? Не лічаць пасобнікам турэмных ахоўнікаў, якога прыставілі, каб выведаць у іх нейкую інфармацыю?**

— Спачатку яны правяралі, ці можна мне давяраць: злівалі «дэзу» і чакалі, усплыве яна дзе ці не. Ацэньвалі, на што я магу згадзіцца. Быў перыяд, калі наогул ніхто не запісваўся на сустрэчу. Я быў ім нецікавы ў плане таго, каб нешта перадаць і прынесці.

**— А што прасілі перадаць?**

— Адзін прасіў перадаць ліст жонцы, другі — патэлефанаваць сябру і сказаць, што «ў яго ўсё нармальна». Хто ж ведае, можа, гэта ў іх кодавая фраза такая. Мяне своечасова папярэдзілі, што гэтага рабіць нельга. Таму ветліва адмаўляў. Раз, другі, трэці... І асуджаныя зразумелі, што праз мяне такія рэчы не пройдуць.

**— З якімі просьбамі яшчэ звярталіся?**

— Здаралася, што чалавек запісваўся на гутарку са мной. Прыходзіў і казаў: «Бацюшка, можна, мы памаўчым?». Я займаўся сваімі справамі, а ён сядзеў і маўчаў. Так ён адпачываў. Бо, разумееце, у турме ж практычна нерэальна пабыць аднаму. Там, у чатырох сценах, кожны сам за сябе, нікому нельга давяраць. Таму некаторыя вырываюцца з камеры, дзе немагчыма быць шчырымі, каб проста памаўчаць. Большасць — каб пагаварыць па душах.

**— Пра што вы з імі размаўляеце?**

— Мы размаўляем пра што заўгодна: пра Бога, жанчын, дзяцей, пра тое, што адбываецца ў свеце...

### «Больш шчырай споведзі, чым у турме, я не чуў за ўсе свае 15 гадоў служэння»

**— Айцец Георгій, ці шмат вернікаў у вашым турэмным прыходзе?**

— Сёння гэта каля 80 чалавек.

**— А колькі ўсяго асуджаных у Навасадах?**

— Больш за тры тысячы.

**— Якія яны, асуджаныя вернікі? Чым адрозніваюцца ад звычайных прыхаджан?**

— Шчырасцю. Больш шчырай споведзі, чым у турме, я не чуў за ўсе свае 15 гадоў служэння. Яны сапраўды шкадуюць і каюцца, што зламалі лёс сабе, сваім блізкім, бацькам, жонкам, дзецям. Я веру ў пакаянне. Няма грахоў, якія Бог не мог бы дараваць. Ёсць людзі, якія не хочуць пакаяцца.

**— Як зняволеныя ставяцца да веруючых сукамернікаў?**

— Па-рознаму. Некаторыя лічаць, што яны нейкую выгаду для сябе знайшлі ў царкве. Я не ведаю. Магчыма, гэта і так. Але я ўпэўнены, што менавіта такім чынам людзі, далёкія ад веры, прыходзяць да Хрыста. Памятаеце, калі Хрыстос заклікаў апосталаў да служэння, ён сказаў: «З гэтага часу вас зраблю лаўцамі чалавекаў». Я лічу, што ёсць сеці д'ябальскія. А ёсць сеці, якія расстаўляе Хрыстос. І ў іх спачатку, магчыма і несвядома, чалавек трапляе. А пасля разумее, што выйсці з іх ён ужо не хоча.

**— А можа, варта, каб пазбегнуць канфліктаў, вернікаў утрымліваць у адной камеры?**

— У мяне быў такі досвед у атрадзе пажыццёвага заключэння. Па просьбе прыхаджан хадайнічаў, каб у якасці эксперыменту вернікаў засялілі ў адну камеру. Адміністрацыя пайшла насустрач. Спачатку ўсё было добра: яны разам маліліся, хадзілі на богаслужэнні. Але недзе праз год пачаліся канфлікты, з'явіліся прэтэнзіі ў бытавым плане. Іх рассялілі. Хоць я і ў гэтым бачу промысел Божы. Яны ж не перасталі быць веруючымі людзьмі. А іншыя бачылі, як яны моляцца, і таксама пачалі прыходзіць спавядацца.

**— Скажыце, а пажыццёва зняволеныя часцей за іншых звяртаюцца да Бога?**

— Не, са 120 чалавек у жодзінскай турме ў 2010 годзе са мной кантактавалі 10 чалавек. Яны знайшлі ў сабе сілы, каб прызнацца ў сваіх грахах. Прыкладна такая ж сітуацыя і ў звычайным жыцці. У царкву ходзіць недзе 1 % ад агульнай колькасці людзей.

**— А спавядаць прыгавораных да смяротнага пакарання не даводзілася?**

— Не. Нават не ведаю, пра што я б з такім чалавекам гаварыў...

### «Я б рэкамендаваў да такой перапіскі ставіцца вельмі асцярожна»

**— Што б вы параілі адзінокім жанчынам, якія адважваюцца на працяглую перапіску з незнаёмцам, які сядзіць у турме?**

— Я б рэкамендаваў да такой перапіскі ставіцца вельмі асцярожна. Не заключаць шлюб паспешліва, тым больш пакуль чалавек у турме. Трэба абавязкова дачакацца, калі ён выйдзе, калі ён праявіць сябе. Таму што лісты — гэта адно, трэба ўсё ж такі глядзець у вочы чалавеку.

**— Бо можна напісаць што заўгодна...**

— Вядома, яны такія дыфірамбы пішуць, што заслухаешся. Каб выглядаць у лепшым святле, у напісанні ўдзельнічаюць усёй камерай. У аднаго почырк прыгожы — ён піша, другі — літаратар па жыцці, вершы складае. Таму тут давярацца толькі лістам — гэта абсурд. Я таксама, калі шчыра прызнацца, супраць спатканняў, асабліва супраць працяглых. Бо яны, як правіла, падразумяваюць сэксуальнае жыццё. Я такіх жанчын не тое каб не разумею. Пэўна, у іх ёсць на гэта прычына. Але гэта несур'ёзна.

**— А ці даводзілася вам вянчаць зняволеных?**

— Двойчы. Вянчаў людзей, якія да гэтага жылі ў шлюбе не адзін год. У абодвух выпадках жанчыны для таго, каб падтрымаць сваіх мужчын, якія аступіўся, вырашалі павянчацца. Таінства праходзіла ў малітоўным пакоі, вянцы трымалі афіцэры.

**— Што вы параіце тым людзям, якія чакаюць сваіх родных з турмы?**

— Не падаць духам і маліцца. Бачыць нават у гэтым няшчасці промысел Божы аб чалавеку, каб яго выправіць. Трэба жыць. І царква будзе суцяшэннем для жанчыны, якая чакае свайго мужа. У дачыненні да яго трэба быць шчырай. Не трэба гуляць у кошкі-мышкі. Атрымліваецца сабраць пасылку — сабралі. Не атрымліваецца — трэба так і напісаць. А то многія зняволеныя прызвычаіліся, што ім бацькі дасылаюць брытву фірмы Gillette, самую лепшую зубную пасту — думаюць, што ім там, на волі, усё так проста дастаецца.

### «Зняволеныя ўспрымалі мяне як Дзядулю Мароза, у якога поўныя кішэні грошай»

**— Айцец Георгій, вам пастаянна даводзіцца слухаць гісторыі пра жорсткія забойствы... Няўжо ніколі не было жадання адмовіцца ад турэмнага служэння? У дэпрэсію не ўпадалі?**

— Не. Менавіта з-за гэтага не. Быў напачатку невялікі перыяд дэпрэсіі, калі асобныя асуджаныя спрабавалі мной маніпуляваць. Прыходзілі і казалі: «Я, вядома, разумею, што ў цябе там сям'я. Але ж Біблія вучыць дапамагаць бліжняму свайму. Збяры мне перадачу». Прыводзілі мне цытаты са Свяшчэннага пісання, і я не ведаў, што сказаць. Больш вопытныя турэмныя святары мяне падтрымалі. Сказалі, што я нікому нічога не абавязаны. Хрыстос казаў: «Калі я магу, я гэта раблю». Я і цяпер нікога не адштурхваю, але даю зразумець, што магу падтрымаць толькі духоўна.

**— Вы хочаце сказаць, што асобныя зняволеныя ўспрымалі вас як Дзядулю Мароза, у якога поўныя кішэні грошай?**

— Можна сказаць і так. Я, дарэчы, у святы і быў Дзядулем Марозам. На Раство ў кожную камеру прыносіў цукеркі ці халву. «На гэтыя цукеркі адкладалі грошы веруючыя бабулькі са сваіх пенсій, і сёння пра вас не забылі, моляцца аб вас». Не толькі жанчыны, а нават мужчыны прымалі пачастунак са слязамі на вачах.

**— Чым кожны з нас можа дапамагчы зняволеным?**

— Калі некаму цікава такое сацыяльнае служэнне, можна падысці да святара і пацікавіцца, што патрэбна. Бо ў зонах сапраўды ёсць людзі, у якіх няма сям'і ці ад якіх адмовіліся сваякі. Яны не атрымліваюць перадач. І ім патрэбна самае элементарнае: бялізна ды прадметы асабістай гігіены.

**— Заключаныя трапілі ў турму не па сваёй волі, у адрозненне ад наглядальнікаў і іншых турэмных супрацоўнікаў, якім таксама патрэбна духоўная падтрымка. Як вы мяркуеце?**

— Безумоўна, турэмны святар прызваны кантактаваць не толькі з заключанымі, але і з людзьмі, якія там працуюць. І апошнім духоўная падтрымка патрэбна не менш. Так, ім нярэдка даводзіцца чуць пагрозы расправы над сям'ёй. Гэта псіхалагічна вельмі няпростая служба. Тут патрэбна вытрымка, пачуццё гумару. Гэта павінен быць вельмі ўраўнаважаны чалавек.

**— А як вы лічыце, ці трэба святару, які плануе працаваць у турме, спецыяльная падрыхтоўка?**

— Безумоўна, трэба праслухаць курс турэмнага служэння. Праўда, у семінарыях пакуль такога курсу няма. Выключэнне — духоўная семінарыя, якая нядаўна адкрылася ў Віцебску. Там будуць рыхтаваць пастараў менавіта для работы ў турмах. Таксама, калі б была мая воля, паставіў бы святара ў турму асобным прыходам, як гэта зроблена ў Аршанскай турме. Бо калі ў святара, акрамя турэмнага прыхода, у падначаленні вясковы альбо гарадскі, часу для зносін з заключанымі вельмі мала.



Царкву, якая знаходзіцца на тэрыторыі папраўчай калоніі № 14 ў Навасадах, будавалі і распісвалі ў пачатку 2000-х гадоў самі асуджаныя. А не так даўно ў храма з'явіўся і свой звон.

### «Там лічаць, што багатых рабаваць можна»

**— «Не крадзі!» — вучыць Біблія. Зняволеныя ж, якія сядзяць за крадзеж, пэўна, неяк па-іншаму інтэрпрэтуюць гэты запавет?**

— Сапраўды, у турме ёсць свае законы, свае паняцці. Так, напрыклад, там вельмі праследуецца так званае «крысятніцтва». Гэта калі я краду нешта — ручку, гадзіннік, лісток... — у суседа па камеры. У той жа час яны лічаць нармальным скрасці нешта ў багатага «дзядзі» недзе на волі. Вось такое «робінгудаўскае» паняцце. Бедных рабаваць нельга, а багатых — можна.

**— Ваша задача — змяніць гэтыя паняцці?**

— Я спадзяюся, што гэта адбудзецца. Хоць не стаўлю перад сабой такой мэты, бо ў іншым выпадку я б ужо даўно сышоў з гэтага служэння, расчараваўся б. Бо чалавек ёсць чалавек. Ён сёння кажа «так», а заўтра — «не». Сёння яму гэта выгадна, таму ён гэта робіць. Заўтра стане нявыгадна, будзе рабіць па-іншаму. Я жыву сённяшнім днём. Зняволены сёння пакаяўся, быў шчырым — і для мяне гэтага дастаткова. Безумоўна, радуюся, калі чалавек, з якім я кантактаваў у турме, выйшаў на волю і жыве нармальным жыццём. Ёсць, дзякуй Богу, і такія прыклады.

**— А ад чаго залежыць — стане чалавек на праведны шлях ці не?**

— Я цвёрда ўпэўнены, што той, хто хоча выправіцца, зробіць гэта. Праўда, ёсць адно «але». Чалавек выходзіць на волю і сутыкаецца з тым, што грамадства яго не прымае. Участковы ледзь толькі што-небудзь здарыцца, пачынае яго тузаць. Уявіце, калі чалавек ні ў чым не вінаваты, а яго перад суседзямі, жонкай зноў выстаўляюць злачынцам, забіраюць у міліцыю. Не кожная псіхіка гэта вытрымае. Таму пакуль грамадства не навучыцца цаніць у гэтых людзях людзей, ставіцца да іх уважліва, дагэтуль турмы будуць актуальныя. Таксама вельмі б хацелася, каб служачыя калоніі, афіцэры паказвалі зняволеным толькі станоўчы прыклад, размаўлялі з імі без матаў, што там лічыцца нормай.

**— Айцец Георгій, а што вам асабіста дала служба турэмнага святара ў духоўным плане?**

— Бачыць у чалавеку чалавека, нягледзячы на тое, што ён зрабіў, за што асуджаны.

**Надзея ДРЫЛА.**
**Фота аўтара і з архіва Свята-Васкрасенскага кафедральнага сабора ў Барысаве.**



У асуджаных розныя лёсы. І мяняюцца людзі ў ізаляцыі таксама па-рознаму. Адны раскайваюцца, іншыя яшчэ больш азлабляюцца.

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.09 | 18.37 | 10.28 |
| Віцебск — | 8.01 | 18.25 | 10.24 |
| Магілёў — | 7.59 | 18.27 | 10.28 |
| Гомель — | 7.53 | 18.26 | 10.33 |
| Гродна — | 8.23 | 18.53 | 10.30 |
| Брэст — | 8.21 | 18.56 | 10.35 |

**Месяц**

***Маладзік 14 лютага.***
***Месяц у сузор'і Авена.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Марыі, Аляксея, Антона, Мялеція, Яўгена.*

***К.*** *Анастасіі, Віктара, Цэзара, Яраслава.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.




## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

## У Ракаў можа пачацца бурны раман, а творчым Дзевам самы час заняцца літаратурнай дзейнасцю

**АВЕН.** Больш разважнасці і рашучасці — у гэтым выпадку ў вас з'явяцца добрыя магчымасці для паляпшэння сваіх асабістых якасцяў. Жыццё будзе віраваць, і з-за гэтага шматлікія планы давядзецца ў корані перагледзець. Паспрабуйце не кідаць слоў на вецер, падмацоўвайце іх справамі, інакш рызыкуеце падарваць свой аўтарытэт. Не ўскладняйце сабе жыццё. Для вас будуць вельмі важныя сустрэчы з сябрамі і актыўны адпачынак. Не паддавайцеся засмучэнню і адчаю, цяпер гэта не ваш стыль. Дзеці могуць заняць увесь вольны час.

**ЦЯЛЕЦ.** Ва ўзоры вашага лёсу пераплятуцца дзве ніткі, адна з якіх уяўляе сабой энергію завяршэння працэсаў, а другая — аднаўленне старых сувязяў, заняткаў. Гэты час спрыяльны для таго, каб развітацца з чымсьці аджылым, са шкоднымі звычкамі, дакучлівымі справамі і надакучлівымі навакольнымі і вызваліць месца для новых людзей або рэчаў. Але не перабярыце меру, чысцячы сваю прастору: можа быць, нешта варта не выкідаць, а прывесці ў парадак, унесці змены ў ранейшыя адносіны, паглядзець на акалічнасці пад іншым вуглом.

**БЛІЗНЯТЫ.** Час трохі зменшыць тэмп. Супакойцеся і хоць трохі адпачніце ад працы. Калі магчыма — вазьміце адпачынак або некалькі дзён адгулаў. Калі ж гэта зрабіць не атрымліваецца, то паспрабуйце хоць бы скараціць аб'ём працы ў першую палову тыдня. Напружаная праца супрацьпаказана. Паступіць шмат карыснай інфармацыі, будуць удалыя дзелавыя сустрэчы. Старыя сувязі працягваюць развівацца — верагодна, яны яшчэ прынясуць добры плён, хоць і не на гэтым тыдні.

**РАК.** Вы шмат працавалі і заслужылі паўнавартасны адпачынак. Можа пачацца бурны раман. Старайцеся не шукаць неадкладных змен, прыслухайцеся нават да слабога голасу інтуіцыі. Перш чым штосьці сказаць, спачатку добра падумайце: у адваротным выпадку — пашкадуеце аб гэтым. Калі ў эмацыйным парыве не скажаце штосьці лішняе, то можа з'явіцца добры шанц для службовага росту. Начальства можа падтрымаць вашы новыя ідэі, калі, вядома, на гэтым тыдні вы зможаце ўбачыць яго, каб іх выказаць.

**ЛЕЎ.** Важная будзе незалежнасць думкі. Паспрабуйце дзейнічаць без аглядкі на меркаванні начальства і калег. Не адкладвайце на няпэўны час выкананне творчых задум, бо вашы ідэі шматгранныя, і якраз цяпер надышоў час для іх рэалізацыі. У сераду не праяўляйце катэгарычнасці — гэта можа ўскладніць стаўленне да вас навакольных, асабліва — калег. І пабольш упэўненасці ў сваіх дзеяннях.

**ДЗЕВА.** Надыходзіць удалы час для далёкіх паездак і адпачынку за мяжой. Творчым асобам задавальненне прынясуць заняткі літаратурнай дзейнасцю. Серада можа прывесці да канфліктаў: будзьце асцярожнымі, бо не выключаны рознага кшталту страты. У пятніцу ўспомніце пра сяброў, з якімі даўно не сустракаліся, і паспрабуйце выправіць недагляд, пакуль яны на вас не пакрыўдзіліся.

**ШАЛІ.** Тыдзень можа аказацца проста вар'яцкім. Не адмаўляйцеся ад прапанаванай дапамогі, бо ў адзіночку будзе складана завяршыць некаторыя важныя справы. Паспрабуйце не ўступаць у канфлікты з калегамі: у чымсьці яны, можа быць, і маюць рацыю. Падумайце, ці так неабходны цвёрдыя прынцыпы — можа, часам варта адступіць ад правілаў і зрабіць выключэнне? Вы ад гэтага не столькі прайграеце, колькі выйграеце. Больш усміхайцеся і жартуйце, гэта так паднімае не толькі ўласны дух, але і настрой навакольных.

**СКАРПІЁН.** Верагодныя значныя поспехі ў сферы адукацыі і ў пасоўванні па сацыяльнай лесвіцы. Але не варта чакаць, што гэтага поспеху вы даможацеся, нічога не робячы, — ён напэўна запатрабуе значных высілкаў. Важныя весткі, атрыманыя нечаканым чынам, могуць змяніць усе планы. Магчымыя клопаты з пажылымі сваякамі або прыдзіркі начальства, калі яно значна старэйшае за вас.

**СТРАЛЕЦ.** Пажадана сувымяраць свае сілы з нагрузкай і не здзяйсняць подзвігаў на працы. Звярніце ўвагу на свой знешні выгляд — гэтыя намаганні не пройдуць дарма, і вас абавязкова заўважаць і ацэняць. У сераду сустрэча са старым сябрам, якую вы даўно адкладалі, нарэшце адбудзецца і прынясе пэўную карысць. Аб'ектыўных цяжкасцяў не пазбегнуць, але вам будзе па плячы рашэнне бягучых задач і жыццёвых праблем.

**КАЗЯРОГ.** Варта займацца толькі тымі справамі, якія ўжо даўно пачатыя і патрабуюць працягу. Больш увагі надайце сваёй сям'і і добраўпарадкаванню дома. Непажаданая пасіўнасць, але ў той жа час неабходна захоўваць асцярожнасць і праяўляць асаблівую ўвагу да тэхнікі бяспекі ў любой справе. Пятніца — удалы дзень для ўсіх відаў інтэлектуальнай дзейнасці. Усё пачатае ў суботу пройдзе вельмі ўдала.

**ВАДАЛЕЙ.** Не дазваляйце карыстацца сваёй дабрынёй у карыслівых мэтах, умейце адмовіць, калі гэта неабходна. У сітуацыі, якая склалася, вам вельмі дапамогуць гнуткасць мыслення і імкненне адчуваць суразмоўцу. Не давайце волю пачуццям і эмоцыям пры зносінах са сваякамі, гэтым вы можаце паставіць сябе ў вельмі няёмкае становішча. Беражыцеся аўторка, у гэты дзень некаторыя вашы таямніцы могуць выплыць на паверхню. У другой палове тыдня з'явіцца рэальная магчымасць змяніць інтэр'ер свайго жылля. Паспрабуйце яе не прамінуць.

**РЫБЫ.** Шмат у чым ваш дабрабыт будзе залежаць ад разумнай зацятасці і кампетэнтнасці. Тыдзень пажадана прысвяціць завяршэнню назапашаных спраў. Не варта планаваць нічога новага, лепш падвесці прамежкавыя вынікі і ацаніць праведзеную працу. Пажадана прысвяціць дастаткова часу пабудове планаў на найбліжэйшую будучыню. Пунктуальнасць у выкананні прафесійных абавязкаў не дазволіць зайздроснікам заспець вас знянацку.

**Гандбол**

## НАПЕРАДЗЕ — ГЕРМАНІЯ І ІСПАНІЯ

**Мінскае «Дынама» і брэсцкі БГК імя Мяшкова чакае выпрабаванне клубамі лепшых чэмпіянатаў кантынента.**

Дзякуючы нядаўнім перамогам, лідары айчыннага гандбола праклалі шлях у еўракубкавую вясну. Згодна з лёсаваннем, мінскае «Дынама» ў чвэрцьфінале розыгрышу Кубка ЕГФ згуляе супраць нямецкага «Гепінгена», а брастаўчане за квіток у паўфінал Кубка Кубкаў пазмагаюцца з іспанскім «Арагонам» з Сарагосы. Цікава, што перад тым, як трапіць на «Арагон», хлопцы Гінтараса Савукінаса перамаглі шведскі «Лугі», а «дынамаўцы» апярэдзілі іспанскі «Гранольерс». Вось такое геаграфічнае дэжавю.

— Вынікі лёсавання ў камандзе ўспрынялі нармальна, без панікі, — каментуе жараб'ёўку Юрый Грамыка, гандбаліст БГК імя Мяшкова. — У апанентах не хацелася ўбачыць буйны нямецкі «Фленсбург». Лепш было б патрапіць на ўкраінскі «Матор». Што тычыцца іспанскага гандбола, ён найперш вызначаецца добрай тэхнікай. «Арагон» — клуб добры. Зараз займае 5-е месца ў сваёй лізе. Іспанскія каманды наогул не могуць быць дрэннымі.

Супернік «Дынама» — з традыцыямі. «Гепінген» восем разоў святкаваў перамогу ў родным чэмпіянаце, калісьці двойчы быў лепшым у гандбольным Кубку чэмпіёнаў, а летась завалодаў Кубкам ЕГФ. Праўда, сёлета ў падапечных Веліміра Петкавіча не ўсё атрымліваецца. Яго каманда зараз толькі на адзінаццатым радку першынства Германіі.

— Пакуль гульні немцаў не бачыў, але мне здаецца, гэты клуб не такі моцны, як у мінулым годзе. Думаю, нам па сілах перамагчы «Гепінген» і прайсці далей. А пакуль усе нашы думкі — пра матч чэмпіянату Беларусі супраць БГК, — прызнаецца гулец «Дынама» Дзяніс Рутэнка.

Першыя матчы чвэрцьфіналаў адбудуцца 17-18 сакавіка, паўторныя — 24-25 сакавіка.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

## ГОРА АД КЕМЛІВАСЦІ

Жыхарка горада Віцебска вырашыла прадаць суседцы па пад'ездзе сем трубак шпалер, што і зрабіла. На наступны дзень вырашыла зноў зайсці да суседкі, каб патэлефанаваць ад яе. Дзверы ў кватэру аказаліся не зачыненымі, дома нікога не было. Жанчына вырашыла скрасці прадукты з халадзільніка. Пакідаючы кватэру з выкрадзенымі прадуктамі, у адным з пакояў яна заўважыла «свае» шпалеры і... прыхапіла іх. А потым зноў прадала шпалеры, але ўжо суседцы з іншага дома.

Невядома, якім быў бы далейшы лёс гэтых шпалер, калі б суседка па пад'ездзе не звярнулася ў міліцыю. Як паведаміў старшы памочнік пракурора Першамайскага раёна г. Віцебска Дзмітрый Лутаў, «кемлівая» жанчына асуджана да пакарання ў выглядзе грамадскіх работ.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## КРЫЖАВАНКА

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ, г. Дзяржынск.



## ЗІМОВАЯ ЛІРЫКА ЯНКІ КУПАЛЫ І ЯКУБА КОЛАСА (Да 130-годдзя з дня нараджэння песняроў)

**Па гарызанталі: 1.** «Каля ёлкі карагоды,\\ Песні, ... жывая». З верша Якуба Коласа «Дзед — госць». **4.** «З Новым годам, што крыніцай\\ Новай пойдзе ў пераходзе,\\Беларуская ...!». З верша Янкі Купалы «З Новым годам!». **8.** «Дзень добры, Новы год! Будзь ласкаў,\\Заходзь у хату, сядзь за ...». З верша Я. Коласа «Тосты». **9.** «Трасецца сетачка сняжынак,\\Як ... прыгожанькіх дзяўчынак». З паэмы Я.Коласа «Новая зямля» («Каляды»). **11.** Быў ... у лістапад,\\А снег пайшоў — стаў першапутак». З верша Віктара Гардзея «Першапутак». **14.** Зіма снежная — ... дажджлівае (прыкмета). **15.** «... пад сярмяжкай\\ На санях клубком». З верша Я.Купалы «Зімовая ноч». **16.** Даў Бог людзям Новы ...,\\Навагодні вечар». З верша Я.Коласа «Пад Новы год» (1944). **17.** «Каб астрогі запярліся\\Ад людзей на вечны ...». З верша Я. Коласа «На Новы год». **20.** «А ... імчыцца, снег здзірае,\\І толькі хвост яго мільгае». З паэмы Я.Коласа «Новая зямля». **21.** «Зноў ... паслала\\снежныя кілімы». З паэмы Паўлюка Труса «Дзясяты падмурак». **26.** Студзень — году пачатак, зіме — ...(прык.). **28.** Цвёрды мінерал. **29.** «На Новы год пасвяткаваць\\У горад завітала ...». З верша «Ёлка» Максіма Танка, якому ў 2012 годзе споўнілася б 100 гадоў з дня нараджэння. **30.** «Ну і мароз — аж нос зрывае! А як на ўсходзе ... грае!». З паэмы Я.Коласа «Новая зямля» («На рэчцы»). **31.** Хутар непадалёк ад в. Мікалаеўшчына, дзе ў 1912 годзе адбылася першая сустрэча Янкі Купалы з Якубам Коласам.

**Па вертыкалі: 2.** «Стынуць вербы, бы змярцвеўшы,\\Тчэ мароз ім свой ... «. З паэмы Я.Коласа «Сымон-музыка». **3.** Пачатак дня. 5. «І ходзіць паважна ... па бары,\\Злы, белавалосы». З верша Я. Коласа «Ноч пад Новы год». **6.** «Ноч глухая, ..., завея». З верша Я.Коласа «Пад Новы год» (1914). **7.** Адзін з відаў атмасферных ападкаў. **8.** Адколаты кавалак чаго-небудзь. 10. «..., віхура свішча, хаты ў снезе аж да стрэх». З паэмы Я. Коласа «Сымон-музыка». **12.** «..., барджэй, барджэй,\\А нам Піліпаўка надакучыла». З каляднай песні. **13.** «Мне воўк і ... у паслугах». З верша Я. Купалы «Мароз». 18. ... вочы адкрывае (прык.). **19.** Прыстасаванне для пераходу цераз канаву, рэчку, гразкае месца. **22.** «Міне зіма нягодная,\\І ўскрэсне зноў ...». З верша Я. Купалы «Зіма». **23.** Што гадок, то і ...(прык). **24.** На Вадохрышча вельмі сцюдзёна — у ... будзе вельмі горача (прыкмета). **25.** «Працякала рэчка\\Скрозь лясныя...». З верша Я. Коласа «На рэчцы зімой». **27.** Мучны выраб; некалі з ... у руцэ гаспадар клікаў Мароз на калядную вячэру.

**Адказы на крыжаванку:**

**Па гарызанталі: 1.** Гутарка. **4.** Зарніца. **8.** Стол. **9.** Смех. **11.** Чарнатроп. **14.** Лета. **15.** Янка. **16.** Год. **17.** Век. **20.** Воўк. **21.** Зіма. **26.** Сярэдзіна. **28.** Агат. **29.** Ёлка. **30.** Чырвань. **31.** Смольня.

**Па вертыкалі: 2.** Узор. **3.** Ранак. **5.** Мароз. **6.** Цьма. **7.** Град. **8.** Сколак. **10.** Халадны. **12.** Каляднікі. **13.** Мядзведзь. **18.** Навука. **19.** Кладка. **22.** Вясна. **23.** Ядок. **24.** Жніво. **25.** Шатры. **27.** Блін.

## НЕ ДУМАЛІ, НЕ ГАДАЛІ, А ІХ... ЭВАКУЯВАЛІ

**У самым цэнтры Брэста, у дзевяціпавярхоўцы па вуліцы Савецкай, бліжэй да сярэдзіны дня заняўся пажар. Гарэла кватэра на шостым паверсе. Выратавальнікі прыбылі хутка, але палаючую кватэру ніхто не адчыняў. Давялося выбіваць дзверы.**

У ахопленым дымам пакоі пажарныя знайшлі нецвярозых 53-гадовага гаспадара і яго 43-гадовую сяброўку. Іх на руках вынеслі з кватэры і перадалі брыгадзе медыкаў. А на пляцоўцы сёмага паверха літаральна валяўся яшчэ адзін п'яны, які, на сваё шчасце, не паспеў яшчэ дабрацца да злашчаснай кватэры. Ад дыму ён страціў прытомнасць і таксама быў перададзены «хуткай».

Жыхароў верхніх паверхаў давялося часова эвакуяваць. Пажар быў ліквідаваны прыкладна за паўгадзіны. Вось так — учынілі стыхійнае бедства жыльцы адной кватэры, а пацярпеў амаль увесь дом.

**Яна СВЕТАВА.**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

П А К А Ш Т У Й Ц Е !

## Бліны? Бліны!

### ПІРОГ «ШЫРОКАЯ МАСЛЕНІЦА»

**Спатрэбіцца:** *бліны (па любімым рэцэпце) — 20 шт., малако (для соуса) — 1 л, мука (для соуса) — 3 ст. л., масла (100 г для соуса + для змазкі формы і праслойкі бліноў), спецыі (мацярдушка, чабор, маяран, базілік), гародніна замарожаная — 400 г, таматная паста (можна таматны сок або кетчуп) — 4 ст. л., сыр цвёрды — 100 г, грудка курыная (вялікая, адварная) — 1 шт., кроп (свежы, для ўпрыгожвання), вада — 0,5 шкл.*

Спачатку трэба напячы любімых блінцоў (1 літр малака, 4 яйкі, 2 шклянкі мукі), 1 ст. л. цукру і 0,5 ч. л. солі, 2 ст. л. алею). Рыхтуем соус. На гарачую патэльню кладзем масла, да распаленага масла дадаем муку, добра змешваем, затым паступова выліваем малако, дадаем спецыі, можна соль і перац на смак, гатуем на сярэднім агні, пастаянна памешваючы, да загусцення (кансістэнцыя павінна быць, як сярэдняй тлустасці смятана). Цяпер робім начынку: гародніну высыпаем на патэльню, выліваем таматную пасту з вадой, пасыпаем любімымі спецыямі і тушым на моцным агні, памешваючы, пакуль амаль уся вадкасць не выпарыцца.



Раздымную форму добра змазваем маслам (дно засцілаем паперай для выпякання), выкладваем блін, на яго некалькі кавалачкаў масла. Цяпер блінамі высцілаем форму, накладваючы іх адзін на другі, каб з борцікаў звісалі бакі. Зверху кладзем яшчэ блін, на яго некалькі кавалачкаў масла і яшчэ адзін блін. Выкладваем палову агародніннай начынкі, паліваем 1/3 соуса, трохі пасыпаем дзёртым сырам.

На сыр кладзем блін, змазваем маслам, потым яшчэ адзін, таксама змазваем, і трэці блін, а на яго курачку, здробненую нажом. Цяпер зноў слой з трох блінцоў, на іх выкладваем агародніннную сумесь, якая засталася, паліваем соусам, пасыпаем сырам. Загортваем блінцы, якія звісалі з борцікаў, змазваем іх трохі маслам. Кладзем яшчэ тры блінцы, прамазваючы іх маслам, верхні блін добра змазваем соусам, які застаўся, і адпраўляем усю гэтую смакату ў разагрэтую да 200° духоўку хвілін на 30, затым пасыпаем сырам і вяртаем яшчэ хвілін на 10 у духоўку. Гатовы пірог дастаем з формачкі, упрыгожваем кропам. Можна яшчэ кропелькамі кетчупу і маянэзу.

### САЛАЖЭНІК ЯБЛЫЧНЫ

**Спатрэбіцца:** *мука (вышэйшы гатунак) — 150 г, вяршкі (тлустыя) — 100 г, малако — 100 г, масла — 100 г, яйка — 3 шт., цукар — 120 г, яблык (вялікія) — 2-3 шт., цэдра лімона.*

Размякчанае масла расцерці з цукрам (50 г). Дадаць крыху цёплыя вяршкі і малако, яечныя жаўткі, дзёртую цэдру лімона і добра змяшаць. Усыпаць прасеяную праз сіта муку і замясіць цеста, як на бліны. У апошні момант дадаць у цеста ўзбіты бялок 1 яйка і спячы блінцы. Яблыкі памыць, абсушыць, ачысціць і дробна нарэзаць. Пасыпаць цукрам, карыцай і абсмажыць на масле да мяккасці. Блінцы пераслаіць яблыкамі. Узбіць астатнія бялкі з цукрам (70 г), заліць блінцы і падрумяніць у духоўцы.



-2828-

У М Е Л Ы Я  Р У Ч К І

## Робім мыла!

**Набліжаецца свята. Вам надакучыла дарыць банальныя рэчы або зусім не ведаеце, чым парадаваць блізкіх? Зрабіце мыла! Натуральнае, з дабаўленнем травы, малака, кавы, ванілі, мёду, солі, карыцы... Спрабуйце, фантазіруйце! Пацешце сваіх блізкіх арыгінальным самаробным карысным падарункам.**



**Спатрэбіцца:** *2 кавалкі мыла па 90 г (лепш браць дзіцячае), 4 ст. л. аліўкавага алею, 100 мл гарачай гатаванай вады, 4 ст. л. кававаі гушчы, 3 ст. л. буйной марской солі (можна ўзяць з нейкімі дабаўкамі, напрыклад, соль для ванны), тарка для надзірання мыла, 2 стальныя каструлькі такога памеру, каб адну можна было паставіць у другую для стварэння «вадзяной лазні», стальныя або драўляныя лыжачкі для размешвання, формачкі для мыла.*

Надзярыце мыла на буйнай тарцы. Вялікую каструлю напоўніце вадой напалову і пастаўце на пліту. Усыпце мыльную стружку ў маленькую каструльку. Дадайце аліўкавы алей. Пастаўце маленькую каструльку са стружкай у вялікую з кіпенем (акуратна, сачыце, каб вада не пералілася). Памешвайце стружку лыжачкай, паступова падліваючы гатаваную гарачую ваду, старайцеся ўсё рабіць акуратна, каб скараціць рызыку ўтварэння камякоў і з'яўлення лішняй пены.

У выніку павінна атрымацца аднастайная пластычная маса. Чым менш у мыльным саставе вады, тым менш будзе дэфармавацца мыла пры сушцы. Для лепшага плаўлення масы можна дадаць кавалачак цукру або мёд. Карысныя ўласцівасці мылу нададуць кававая гушча і марская соль. Дадайце іх у мыльную масу і добра змешвайце не менш за 3 хвіліны.

Формачкі трэба змазаць аліўкавым алеем. Выкладваем у іх мыльную масу, як след утрамбоўваючы. Звычайна мыла сохне 2-3 дні пры пакаёвай тэмпературы, пасля чаго гатова да ўжывання.

Іншыя дабаўкі: разнастайныя эфірныя алеі; пялёсткі кветак і травяныя зборы; аўсяныя шматкі; костачкі ягад і здробненыя спецыі; рысавыя зярняткі, мёд, какосавая стружка. Нельга толькі выкарыстаць свежыя ягады, садавіну або гародніну, бо мыла можа заплеснець, асабліва пры доўгім захоўванні.

Варта быць таксама асцярожнымі з эфірнымі алеямі: дадаваць не больш за 10-15 кропляў. Каб надаць мылу колер, спатрэбяцца фарбавальнікі — альбо харчовыя, альбо натуральныя настоі зёлак і сокі. Часам у якасці фарбавальніка выкарыстоўваюць алей, які ўжо мае насычаны колер.



Калі хочаце атрымаць шматслойнае або паласатае мыла, заливайце яго ў форму паступова. Дачакайцеся, пакуль высахне адзін слой, і толькі затым залівайце наступны.

-2829-

**І песню родную люблю я...**

# Зорка Венера

**ПЕСНЯ «Зорка Венера» — візітоўка Нацыянальнай харавой капэлы імя Рыгора Шырмы... Яна ўвайшла ў рэпертуар гэтага праслаўленага калектыву з першых дзён яго існавання. І ўвесь час, на працягу многіх дзесяцігоддзяў, у выкананні капэлы твор гучыць па-юнацку свежа, эмацыйна ўсхвалявана, абуджаючы рамантычна ўзрушаныя памкненні слухачоў.**

Успрымаецца песня і як музычны помнік яе стваральнікам і яе нястомнаму папулізатару Рыгору Шырму.

Доўгі час лічылася, што музыка песні «Зорка Венера» — народная, і яе ў 1935 годзе занатаваў на Навагрудчыне Рыгор Шырма. Але мужны прапагандыст і актыўны збіральнік беларускай песні ведаў пра яе аўтараў. Вакальныя творы кампазітара-аматара (і грамадскага дзеяча) Сымона Рака-Міхайлоўскага бытавалі на Беларусі. Асабліва блізка іх успрымала нацыянальная інтэлігенцыя. Аднак імя гэтага дзеяча пэўны перыяд не згадвалася ў друку. Таму музыку песні «Зорка Венера» выдавалі за народную, што дазваляла яе выконваць на сцэне. Нацыянальна-культурны ўздым, што агарнуў беларускую грамадскасць у 1920—30-я гады, актывізаваў пашырэнне дзівоснай перлінкі вакальнай музыкі.

У асяродку сучаснай інтэлігенцыі песня «Зорка Венера» выступае як гімн каханню (а гімн — урачыстую песню — мусяць ведаць усе прысутныя. Агульны спеў яднае супольнікаў, умацоўвае іх стваральны дух). Не толькі моладзі падабаюцца пачуццёвая напоўненасць і шчымлівая развага лірычнага героя. Яго распавед, у якім першы радок кожнай страфы з'яўляецца і яе чацвёртым, але незакончаным, псіхалагічна выразна перадае напружаны стан душы ў прадчуванні непазбежнай ростані, няспраўджанасці надзей. Псіхалагічнае ўспрыманне песні ўзмацняецца, калі згадваеш, што за постаццю прывіднай асобы праглядваюцца прывабныя рысы дзяўчат: Ганны Какуевай, сястры гімназічнага таварыша, у якую Максім Багдановіч быў моцна закаханы, але яна выйшла замуж у 1914 годзе; магчыма, і Ю. Кіціцынай, з якой ён пазнаёміўся ў 1909 годзе на лячэнні ў Крыме (верш датуецца 1912 годам.) А музыка песні, рытмічна-інтанацыйным ладам блізкая да раманса, улагоджвае душэўны стан, супакойвае парыванні, скіроўвае іх да вечаровага неба, да чароўнай зоркі, як называюць планету Венеру, спадарожніцу закаханых.




### ЗОРКА ВЕНЕРА

*Верш Максіма Багдановіча* — *Музыка Сымона Рака-Міхайлоўскага*

Зорка Венера
ўзышла над зямлёю,
Светлыя згадкі
з сабой прынясла...
Помніш, калі я спаткаўся з табою,
Зорка Венера ўзышла.

З гэтай пары я пачаў угглядацца
Ў неба начное і зорку шукаў.
Ціхім каханнем к табе разгарацца
З гэтай пары я пачаў.

Але расстацца нам час наступае;
Пэўна, ўжо доля такая у нас...
Моцна кахаў я цябе, дарагая,
Але расстацца нам час.

Буду ў далёкім краю я нудзіцца,
Ў сэрцы любоў затаіўшы сваю,
Кожную ночку на зорку дзівіцца
Буду ў далёкім краю.

Глянь іншы раз на яе, —
у расстанні
З ёю зліём мы пагляды свае...
Каб хоць на міг
уваскрэсла каханне,
Глянь іншы раз на яе...

**Падрыхтаваў**
**Міхась ШАВЫРКІН.**

**Дзве даты**

## 25 лютага

**1920 год** — нарадзіўся (вёска Альшоў Хоцімскага раёна) Пятро Прыходзька, вядомы беларускі паэт, перакладчык. У 1939 годзе, пасля заканчэння Хоцімскай сярэдняй школы, паступіў у Камуністычны інстытут журналістыкі імя С.М. Кірава ў Мінску. У 1940 годзе прызваны ў Чырвоную Армію. Удзельнічаў у баях на Бранскім фронце, на Курскай дузе, у вызваленні Беларусі, Польшчы, у баях за Берлін, за вызваленне Прагі. Упершыню ў рэспубліканскім друку выступіў у 1937 г. (газета «Чырвоная змена»). У пасляваенны час працаваў у часопісе «Беларусь», газетах «Звязда», «Літаратура і мастацтва», на Мінскай студыі навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў, у выдавецтвах «Беларусь» і «Мастацкая літаратура». Аўтар паэтычных зборнікаў «Салдаты міру», «Голас сэрца», «Ранак над Эльбай», «Калінавыя зоры» і многіх іншых. Пісаў для дзяцей, выступаў як публіцыст. Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Аркадзя Куляшова за зборнік «Парог памяці» (1985). Памёр у 2006 годзе.



**1956 год** — першы сакратар ЦК КПСС М.С. Хрушчоў выступіў на XX з'ездзе КПСС з дакладам «Аб кульце асобы і яго наступствах», у якім утрымліваліся звесткі аб шматлікіх «адступленнях» ад ленінізму і парушэннях «сацыялістычнай законнасці», масавых рэпрэсіях у дачыненні да партыйных, дзяржаўных, гаспадарчых і ваенных кадраў.

**Цытата дня**

***«Нічога не скажаш, апроч: век жыві і век вучыся».***

**Іван Грамовіч (1918—1986), беларускі пісьменнік.**

Віншуем **Алену Леанідаўну ПАРХОМЕНКУ** з г. Калінкавічы **з днём нараджэння!**

Жадаем разам з Валерыем Мікалаевічам выхоўваць Паўліка, Ангелінку, Ванечку ў здароўі, шчасці, каханні, павазе, дабрабыце.

**З любоўю Леанід Піліпавіч і Вольга Іванаўна Сіражы.**

## Усміхнемся

У кавярні.
— Дзяўчына, прынясіце пасту!
— Дома зубы трэба было чысціць!
— Вы ведаеце, паста — гэта вараная макарона з соусам.
— Вой, чым толькі людзі зубы не чысцяць!

**Не так даўно я кінула есці пасля шасці вечара. Але таямнічым чынам пачала есці пасля трох ночы...**

Ранішняя гутарка па тэлефоне з начальнікам:
— Іван Іванавіч, я на працу сёння не прыйду.
— А што такое?
— Ды жонка 10000 рублёў згубіла.
— І што?
— А я на іх стаю.

**Мяснік-рамантык 14 лютага: пры куплі 1 кілаграма фаршу — сэрца ў падарунак.**



— Алё, Вова, гэта ты?
— Так, я.
— Вова, я цяжарная.
— Няправільна набраны нумар.

2012 ГОД КНІГ

# ЧЫТАЕМ КУПАЛУ РАЗАМ

*Магутнае слова ты, роднае слова!*
*Са мной ты наяве і ў сне;*
*Душу мне затрэсла пагудкаю новай,*
*Ты песень навучыла мяне.*
*Янка Купала.*
*«Роднае слова». 1908*

Пагасла старая люстра, прыцішаную залу ахінуў цень, які адразу расступіўся перад святлом ад кінаэкрана. З белага палатна праз тоўшчу гадоў на нас глядзеў Янка Купала. Ён чытаў вершы...

Як гучаў запісаны калісьці голас песняра, можна было пачуць у зале Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы. У гэты ж вечар тут можна было таксама пачуць, як чытаюць Купалу сёння. Дзеля гэтага з нагоды першага этапу грамадска-культурнай акцыі «Чытаем Купалу разам» сюды прыйшлі людзі розных узростаў, захопленыя гучаннем роднай мовы, паэтычнай думкай Купалы, энергетыкай яго душы.

На парозе музея гасцей віталі дзяўчаты ў традыцыйных вышыванках, а побач з жывапіснага палатна на ўсіх пагл ядаў сам паэт.

Іншыя партрэты Янкі Купалы разам з некаторымі яго ўласнымі рэчамі можна было ўбачыць пад шклом музейных вітрын у той жа самай зале. Побач са старымі фотаздымкамі былі найкаштоўнейшыя выданні з музейных фондаў, якія захавалі на сваіх старонках надпісы, зробленыя самім песняром. Нябачны мост быў перакінуты паміж стагоддзямі, і для кожнага, хто крочыў па ім, гучалі вершы паэта-прарока.

Вершы з купалаўскіх сшыткаў чыталі вядомыя грамадскія дзеячы, літаратары, артысты. Сярод удзельнікаў былі прадстаўнікі Грамадскай рады па справах культуры і мастацтва пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь. Кожны, хто выходзіў да мікрафона, каротка казаў, чаму ён узяўся чытаць менавіта гэты купалаўскі верш. Так, міністр культуры Павел Латушка растлумачыў свой выбар лірычнага верша. Старшыня Рады Беларускага фонду культуры У. Гілеп распавёў цікавую гісторыю, якая звязана з адной са старых кніжак. Старшыня нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА Уладзімір Шчасны парадаваў не толькі артыстычным чытаннем, але і падарункам для музея — рэдкай кнігай. Што датычыцца найлепшага выканання (калі б такая намінацыя тут існавала), то ўсе сімпатыі забраў бы народны артыст СССР Генадзь Аўсяннікаў — верш «Я мужык-беларус» ён прачытаў так, што зала літаральна выбухнула ўдзячнымі апладысментамі. Вершы, створаныя амаль стагоддзе таму, і сёння дакладна перадаюць склад душы беларуса, яго думкі, звычаі. Пра гэта спадчыннае багацце, зразумелае сёння людзям розных нацыянальнасцяў, казаў рускі па паходжанні кінарэжысёр Аляксандр Яфрэмаў. А тое, як цудоўна кладуцца купалаўскія словы на музыку, даў пачуць паэт і музыка А. Камоцкі.

На месцы старой хаткі, дзе з 1927-га па 1941 год жыў Янка Купала, у памяць пра песняра створаны мемарыяльна-скульптурны комплекс, гасцінна расчынены дзверы музея. Нават калі вам не давялося прысутнічаць на гэтай вечарыне, дзе Купалу чыталі разам, — завітайце сюды, каб убачыць кнігі, рукапісы, рэчы паэта. Завітайце, і вы міжволі паўторыце пра сябе яго радкі. Вы прачытаеце іх па-свойму, але тымі ж словамі, якія прагучалі некалі з вуснаў Народнага паэта Беларусі Янкі Купалы.

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**



Вершы Янкі Купалы чытае міністр культуры Беларусі Павел ЛАТУШКА.





Чытае дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь Уладзімір ПРАКАПЦОЎ.





Старшыня нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА Уладзімір ШЧАСНЫ перадае падарунак дырэктару музея Алена ЛЯШКОВІЧ.



Пра лёс кнігі расказвае старшыня Рады Беларускага фонду культуры Уладзімір ГІЛЕП.



Гучыць песня ў выкананні Алесь КАМОЦКАГА.

Наш культурны асяродак
**Жырандоля**
Выпуск № 7 (136)

Дзеля памяці

# «...А БАЛІЦЬ — НЕ ВЫМАВІЦЬ»

## Паэту Алесю Пісьмянкову, які пайшоў з жыцця заўчасна, сёння споўнілася б 55 гадоў

**ЛЮДЗІ, бывае, згараюць. Як васковыя свечкі... Аддаюць сябе цалкам — дзеля прыгожага, яркага агню, які гарыць ціха і ўпэўнена, ведаючы сваю справу. Гарыць без копаці, паху штучных дабавак і струменчыкаў аплаўленага матэрыялу ў адрозненне ад парафіну. Парафін можа падавацца больш зручным: расплавіў — і ляпі з яго што хочаш, можаш выкарыстоўваць яшчэ і яшчэ, да таго ж танней каштуе. Парафін выцясняе воск, які дорага каштуе. Але тыя, хто любіць шчыры агонь, аддаюць перавагу васковым свечкам, якія, напрыклад, вырабляюць у манастырах для сардэчнай малітвы...**



Вершы Алеся Пісьмянкова вельмі падобныя на малітву, якая нараджалася ў самых глыбінях чалавечай душы. Слова «глыбіня» ў чалавечым свеце часта ідзе ў спалучэнні са словам «цёмная». Але глыбіня Пісьмянкова асобная — яна заўсёды была светлай, і такое адчуванне, што бясконцай. Можа, так цяпер думаецца, калі разумееш, што чалавека ўжо няма і пайшоў ён у 2004 годзе ў росквіце сіл. І колькі ён яшчэ мог бы сказаць. І сапраўды ж мог! Таму што самі словы, якія ішлі ў яго ад сэрца, вечныя: за імі стаіць сутнасць чалавечай істоты, якая імкнулася і спадзявалася заслужыць права на павагу перад людзьмі і Богам. Яго глыбіня была з пакаяннем. І не толькі за сябе самога: ён бачыў, ведаў і любіў Беларусь, часцінкай якой быў і не аддзяляў сябе ад яе. Прычым адну з рыс, уласцівую нашаму народу, Пісьмянкоў увасобіў дзіўным чынам, без аніякай ганарлівасці: чалавечая высакароднасць для яго была на першым месцы. «Вы пра прыстойнасць? // І я пра тое. // Для вас п р ы с т о й н а, // Каб стаў я ў стойла. // Для вас прыстойна, // Каб я ў тым стойле // Стаяў маўкліва // І хрумстаў смачна, // Ківаў лісліва // І быў шчаслівы — // За корм удзячны».

Яго глыбіня бясконцая яшчэ і таму, што сапраўды без дна. Што значыць жыць з «двайным дном», ён наогул не ўяўляў, таму што заўсёды быў самім сабой. Не дазваляў, каб з яго, нібыта з паслухмянага парафіну, ляпілі зручную ў карыстанні рэч. Быў прамым і адкрытым. Пра гэта, адзначаючы юбілей паэта, будуць казаць у гэтыя дні тыя, хто яго ведаў: ад роднай вёскі Бялынкавічы, што ў Касцюковіцкім раёне, да сталіцы, якую паэт здолеў скарыць. Пра гэта будуць сведчыць яго родныя, сябры, калегі і чытачы: Алесь Пісьмянкоў быў сапраўдным і ў жыцці, і ў творчасці. Здаецца, ён не разводзіў гэтыя з'явы наогул. Проста творчасць для яго і была тым жыццём, якое мела сэнс. Пачытайце!

І вы зразумееце, што яго жыццёвая чалавечая глыбіня заўсёды застанецца напоўненай цудна-дзівосна-зіхатлівымі перлінамі-творамі, які нібыта з маленькіх, ледзьве заўважных воку пясчынак утварыліся з чалавечых думак. Іншая справа, што, каб выраслі перліны, патрэбны час. Доўгі час. У Пісьмянкова яго не было. Хоць сам ён, напэўна, не задумваўся пра тое, каб падоўжыць свой зямны час: не жыў спакойна, усё браў блізка да сэрца, за ўсё перажываў. Згарэў. Яму сапраўды балела... Бывае, што ўтойваць гэта яшчэ больш балюча, чым сказаць. Таму ён пакінуў пасля сябе цудоўнейшыя думкі, кожная з якіх трапляе ў сэрца і запальвае там агонь, які потым гарыць чыста і асэнсавана. І галоўнае — не абпальвае. Дакраніцеся да яго...

«НЕ ЗНІКАЙ» — так называецца кніга выбраных вершаў Алеся Пісьмянкова, што неўзабаве пабачыць свет у выдавецтве РВУ «Літаратура і Мастацтва». Кніжку склалі вершы з выдадзеных раней зборнікаў і таксама тыя, якія яшчэ не друкаваліся.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

### Алесь ПІСЬМЯНКОЎ

*Забываў —*
*не выпала.*
*І паліў —*
*не выпаліць.*
*Ані ў Бога —*
*вымаліць,*
*Ані ў д'ябла —*
*выманіць,*
*А баліць —*
*не выбаліць*
*А баліць —*
*не вымавіць.*

**ЗВАНАР**

*А звон заве ісці на вы,*
*Нібыта голас чалавечы.*
*Ён Беларусь заве на веча,*
*Каб адстаяць свае правы.*
*...Былым павеялі вякі*
*І прыгадалася нанова,*
*Каб у народа вырваць мову,*
*Ў званоў ірвалі языкі.*

***

**ПРА ЗОРКІ**

*Продкі газет не чыталі —*
*Продкі чыталі па зорках.*
*Наіўна свой шлях вызначалі*
*Па іхняй гаворцы.*
*Начамі ў пячоры іх чорныя*
*Заходзілі зорныя сны.*
*Веру — парою зорнаю*
*Прыдумалі жорны яны.*
*Веру — парою зорнаю,*
*Калі я і сам не сплю,*
*Прашчур мой непакорлівы*
*Ціха шапнуў: «Люблю!..»*
*Продкі газет не чыталі —*
*Продкі чыталі па зорках.*
*Наіўна свой шлях вызначалі*
*Па іхняй гаворцы.*
*Святло ліючы непагаснае,*
*Зоркі не веялі згубаю:*
*Не страшна было,*
*не страшна*
*Зоркаю, зорачкай яснай.*

***

**НАДЗЕЯ**

*Залатая мяцеліца*
*Зноў сярэбранай зменіцца.*
*Можа, ўсё пераменіцца,*
*Можа, ўсё перамелецца.*
*Можа, ўсё, што засмечана,*
*Заіскрыцца,*
*Засвеціцца.*
*І забудзецца дробнае,*
*І згадаецца добрае,*
*І прыпомніцца роднае,*
*Векавое,*
*Нязводнае,*
*І з усмешкаю ветлаю*
*Павітаецца светлае.*
*Павітаецца,*
*Парукаецца.*

***

*Мы слухаем,*
*як асцярожна*
*Па золаце*
*саду*
*ідзе басанож*
*Наш сонечны,*
*летні,*
*апошні*
*І першы*
*наш восеньскі дождж*

**БЕЛАРУСІ**

*Я люблю цябе розную:*
*Росную і*
*марозную,*
*Ціхую і*
*журботную,*
*Годную і*
*гаротную,*
*Родная!*
*На цябе на адну*
*Я малюся,*
*За цябе,*
*Беларусь,*
*я журуся...*

***

*Завея ў зімовым садзе*
*Гарачыя словы студзіць,*
*Яшчэ ўсё ва ўмоўным ладзе:*
*«Пабачым,*
*магчыма,*
*будзе...»*

Фольknaпрамак

# Песні ў стылі «Ой!»

**Нацыянальны акадэмічны хор імя Генадзя Іванавіча Цітовіча яшчэ памятае людзей, якія працавалі з яго заснавальнікам. Галоўны з іх — мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Міхаіл Дрынеўскі. Ён працаваў з Цітовічам шэсць гадоў. Сёлета выдатны калектыў адзначае 60-годдзе.**

Нягледзячы на свой паважаны ўзрост вядомы хор — вельмі сучасны і зусім не кансерватыўны. Выступленні калектыву не статычныя. Яны насычаны танцамі, спевамі, музыкай, народнымі інструментамі і касцюмамі. Дарэчы, многія строі для гэтага хору распрацаваў вядомы мастак Юрый Піскун. Гэта варыяцыі на тэму беларускага народнага касцюма і нават часткова дакладныя копіі з яго.

Шасцідзесяцігоддзе — важная дата не толькі таму, што сведчыць пра велізарны вопыт і запатрабаванасць (раз калектыў існуе ўжо столькі гадоў)! Гэта яшчэ і дадатковы стымул. Чаго? Разважае **першы намеснік міністра культуры Уладзімір КАРАЧЭЎСКІ:**

— Гэта вельмі значная падзея. Нягледзячы на глабалізацыю, крызіс, на тое, што ў авангардзе знаходзяцца, можа быць, іншыя віды мастацтва, хор жыве, плённа працуе. І тое, што ён робіць, вельмі патрэбна Беларусі сёння. Я лічу, што гэта тое, чым наша краіна можа ганарыцца. Хор імя Цітовіча — гэта сапраўдны брэнд. Гэта яднанне розных відаў мастацтва. І перад намі зараз стаіць задача — захаваць нашу спадчыну. У тым ліку і праз падтрымку Нацыянальнага хору імя Цітовіча. Юбілей калектыву стымулюе думкі і дзеянні ў гэтым кірунку.



Фота з сайта www.belhor.by

29 лютага ў Белдзяржфілармоніі адбудзецца адмысловы канцэрт Нацыянальнага акадэмічнага хору імя Генадзя Цітовіча. Цікава, што 60 гадоў таму хор утварыўся акурат у гэты ж высакосны дзень. І сёлетняя дата супала з датай заснавання. Што чакае слухачоў на юбілейным канцэрце?

— Рэпертуар у нас вельмі вялікі! У адзін канцэрт усё не «ўтопчаш», — распавядае **Уладзімір ДРЫНЕЎСКІ.** — Але ў гэты канцэрт мы вырашылі ўключыць толькі беларускае. Выключэннем будзе адна карэйская песня, дзеля экзотыкі. Гэта будуць народныя песні, крыху аўтарскіх, танцы, беларуская музыка. Усё тое, чым мы ганарымся і павінны ганарыцца. Наш фальклор вельмі багаты, ён адрозніваецца ад рускага і ўкраінскага. У нас няма «Распрагайце, хлопцы, коней» — такіх песень душа-наросхрыст. Затое ў нас амаль усе песні пачынаюцца з «Ой»... Ну што ж — такая наша гісторыя, такі лёс, такая наша культура. Але ж «Ой» не заўсёды балючае, ёсць «Ой» і ўсхваляванае.

Гледачы змогуць пабачыць не толькі такія пазнавальныя харэаграфічныя нумары, як «Лявоніха», «Мяцеліца» і інш., але і новыя пастаноўкі па фальклорных матывах, якія яшчэ ніхто не бачыў: вітанне «Добры вечар добрым людзям», «Купалінка», «Масленіца», «Вяселле».

— Мы ў першую чаргу танцуем песню, — распавядае **Галіна ГАРЫНОВІЧ, рэпетытар па балеце.** — Але артысты нашага калектыву выконваюць высакакласныя тэхнічныя элементы, трукі, якія характэрныя для чыста балетных труп, хоць наш склад невялікі — усяго 10 пар. Але за якасць мы адказваем.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

# Казкі — дзецям

**Экзархат Беларускай праваслаўнай царквы, Дом Масквы, Саюз пісьменнікаў Беларусі, тэатральная школа №1 г. Мінска пры Новым драматычным тэатры і Мінская дзяржаўная гімназія-каледж правялі дабрачынную акцыю для навучэнцаў дзіцячых дамоў і дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі «Разам з кнігай мы расцём», якая распачалася ўчора.**

— Сутнасць акцыі, — распавядае пісьменніца Наталля Голубева, — у тым, каб падарыць маю казку «Казкі цётачкі Руф» дзецям пры дапамозе малюнкаў, тэатральнай пастаноўкі і пры ўдзеле іншых дзяцей.

Цікавай была мастацкая выстава Рыты Цімохавай, якая праілюстравала кнігу «Казкі цётачкі Руф» (кніга атрымала першую прэмію на Нацыянальным конкурсе «Мастацтва кнігі-2012»), а таксама спектакль паводле кнігі, пастаўлены рэжысёрам Віргініяй Тарнаўскайтэ. У спектаклі задзейнічаны навучэнцы тэатральнай школы №1. Гэты дзіцячы тэатр неаднаразова браў удзел у міжнародных дзіцячых конкурсах, станавіўся лаўрэатам прэстыжных фестываляў, гастраляваў у Літве і Расіі.

Мінскай дзяржаўнай гімназій-каледжам мастацтваў абвешчаны конкурс дзіцячага малюнка на тэму «Свет вачыма дзяцей», вынікі якога плануецца падвесці 1 чэрвеня, у Дзень абароны дзяцей.

**Зоя СВЕТЛАЯ.**

Славутыя землякі

## Чвэрць стагоддзя Мікалай Гайба разгадвае загадкі з гісторыі роднага краю і жыцця Адама Міцкевіча

# «Я МАЮ КРАЙ, АЙЧЫНУ ДУМ МАІХ»

**Пачатак сёлетняга года, які абвешчаны ў Беларусі «кніжным», дырэктар Дома-музея Адама Міцкевіча ў Навагрудку Мікалай Гайба адзначыў выхадам новай кнігі «Сэрцу мілая Айчына» (вобраз Радзімы ў жыцці і творчасці Адама Міцкевіча). Менавіта ў студзені, дарэчы, споўнілася 25 гадоў з часу першай публікацыі Мікалая Паўлавіча па гісторыі Навагрудчыны.**



— Няўжо застаюцца загадкі, у якіх яшчэ не разабраліся гісторыкі і краязнаўцы? — пацікавіўся я ў Мікалая Гайбы, які мае, зразумела, неафіцыйнае, але ад таго не менш пачэснае «званне» летапісца Навагрудчыны.

— Напрыклад, такая дэталь. Маладога Адама Міцкевіча мастакі часта пішуць з каштанавым колерам валасоў. Мне сустрэлася апісанне знешняга выгляду паэта, якім яго бачыў сучаснік Алаіз Невяровіч. Дык, аказваецца, «валасы яго былі вельмі чорныя». І наўрад ці ён фарбаваўся!..

Увогуле, калі паглядзець у нашых бібліятэках, дык там ёсць творы Адама Міцкевіча, але даследчых кніг пра нейкія кірункі яго жыцця фактычна не знойдзем. Міцкевіча даследуюць у асноўным літаратары, філолагі, а не гісторыкі. Пры гэтым у беларускім міцкевічазнаўстве практычна не выкарыстоўваецца карэспандэнцыя Адама Міцкевіча, якая дае магчымасць зразумець яго грамадзянскую пазіцыю, бачанне ім сваёй Радзімы і стаўленне да яе. Магчыма, у Беларусі не так лёгка гэту карэспандэнцыю знайсці, але ў нашым музеі ёсць тры аб'ёмныя тамы пісьмаў Міцкевіча на польскай мове, два тамы перапіскі філаматаў, а таксама шэраг брашур, якія выходзілі ў 70-80-я гады XIX ст. з карэспандэнцыямі паэта. Чытаў і разумеў, што пра гэта ў кнігах пра Міцкевіча нідзе не напісана.

За 150 гадоў, што прайшлі пасля смерці Адама Міцкевіча, у Польшчы выдадзены сотні кніг па розных аспектах жыцця і творчасці: «Адам і Марыля», «Міцкевіч і грамадска-палітычнае жыццё», «Міцкевіч як настаўнік»... Але, мяркую, пра Адама Міцкевіча і Радзіму лагічна пісаць менавіта тут, у Беларусі — як пра земляка.

### «Правінцыялізмы»? Я іх ужываў свядома!»

Ведаеце, напрыклад, што ў сваіх пісьмах Адам Міцкевіч восем разоў ужываў слова «Беларусь»? Не агульнавядомае «Літва! Мая Айчына!», а менавіта Беларусь. Напрыклад, у лісце да Ігната Дамейкі ад 7 студзеня 1839 года ён паведамляе, што «Янэк (Чачот) вярнуўся на Беларусь».

— У шырокім разуменні Літвой у часы Міцкевіча працягвалі лічыць усю тэрыторыю сучасных Беларусі і Літвы, паколькі яны на канец XVIII ст. былі аб'яднаны ў Вялікім Княстве Літоўскім, — гаворыць Мікалай Гайба. — Грамадзяне гэтай краіны называліся літвінамі. Літвінам лічыў сябе і Адам Міцкевіч, пра што ў кнізе «Сэрцу мілая Айчына» шмат пацвярджэнняў. У XIX ст. тэрыторыя былой вялікай дзяржавы складалася з розных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў. Прычым менавіта сучасную Беларусь, на мой погляд, Міцкевіч і лічыў сваёй радзімай, пра якую пісаў: «Я маю край, Айчыну дум маіх». Гэта зразумелі ўжо ў XIX ст. — вядомы тагачасны даследчык Адам Кіркор у кнізе «Живописная Россия» (1882) заўважыў, што Адам Міцкевіч «па выхаванні, па першых працах сваіх належыць Літве, якая ва ўспамінах усяго яго жыцця, ва ўсіх яго творах зліваецца з Беларуссю».

Пакінула свой след у жыцці і творчасці Міцкевіча і сама беларуская мова, словы якой ён свядома выкарыстаў у шэрагу твораў. Вось, напрыклад, беларусізмы з паэмы «Пан Тадэвуш»: халадзец, каўтун, зашчапа, дзяркач, падвода, гарбуз, мятліца, незабудка, свірэпа, расол, атава, прызба, покуць, сені, пракосы, вырай. І гэты пералік далёка не поўны. У ранейшых польскіх выданнях пісалі, што гэта рэгіяналізмы, і давалі літаратурныя словы папольску. Да таго ж, варшаўскія крытыкі часта папракалі паэта за беларускія словы ў яго творах, за псаванне «польскага стылю». На што Адам Міцкевіч адказваў: «Прызнаюся, што я не толькі не асцерагаюся правінцыялізмаў, але, можа, свядома іх ужываю». Пісаў — як адчуваў.

«З усіх славянскіх народаў русіны, гэта значыць сяляне Пінскай, часткова Мінскай і Гродзенскай губерняў, захавалі найбольшую колькасць агульнаславянскіх рыс. У іх песнях і казках ёсць усё ... «Літоўскі Статут» напісаны іх мовай, самай гарманічнай і з усіх славянскіх моў найменш зменёнай», — такую ацэнку вартасцям беларускай мовы даваў Адам Міцкевіч, працуючы выкладчыкам каралеўскага ўніверсітэта Каледж дэ Франс у Парыжы.

Магчыма, пры больш спрыяльных умовах ён пісаў бы творы і па-беларуску, але не было яшчэ ні беларускага чытача, ні беларускага выдаўца.

Дарэчы, цяпер, пры незалежнай Беларусі, я бачыў у Польшчы кнігі, дзе прызнаецца, што Міцкевіч выкарыстоўваў не рэгіянальныя польскія словы, нейкія дыялектызмы, а менавіта ўзятыя з беларускай мовы.

А вось апісанне яго родных мясцін у польскіх кнігах, як правіла, зводзіцца да выказвання, што Навагрудак — гэта невялічкае мястэчка ў Літве. Таму ў маёй кнізе зроблена спроба даць разгорнутую характарыстыку горада ў першай палове XIX ст., а таксама паказаць некаторыя моманты жыцця Навагрудка ў пазнейшыя часы, звязаныя з ушанаваннем памяці Міцкевіча.

### Дзе пахаваны бацькі Адама Міцкевіча?

— У мяне добрыя творчыя стасункі са многімі міцкевічазнаўцамі (польскія калегі, дарэчы, ужо прапанавалі перавыдаць кнігу «Сэрцу мілая Айчына»), але, натуральна, ёсць і разыходжанні ў тых ці іншых ацэнках. Напрыклад, дзе пахаваны бацькі Адама Міцкевіча?

У прыватнасці, польскі даследчык Яраслаў Марэк Рымкевіч мяркуе, што, хутчэй за ўсё, там, дзе цяпер у Навагрудку гара Міндоўга. І, маўляў, калі ў тым месцы пахаваны бацькі Міцкевіча, то трэба надаць гары гэтае імя, пераназваць яе. Але, па-першае, Міндоўг для нас больш важны, чым для Польшчы. Няўжо думаюць, што ён нам не патрэбны? А па-другое ...

У адпаведнасці з запісам у рэгістрацыйнай кнізе, Барбара Міцкевіч была пахавана на дамініканскіх могілках у Навагрудку. Сёння ў горадзе няма могілак з такой назвай. Што ж мелася на ўвазе? Сапраўды, на пачатку XIX ст. на гары Міндоўга знаходзіліся могілкі. Аднак я знайшоў успамін Вінцэся Каратынскага, які сцвярджаў, што Дамініканскаму касцёлу і раней, і ў сярэдзіне XIX ст. належалі іншыя могілкі. З яго апісання я зрабіў выснову, што на сённяшні час гэта так званыя старыя хрысціянскія могілкі, якія існуюць цяпер непадалёк ад гарадскога цэнтра. Праўда, надмагільных помнікаў Міцкевічаў там пакуль не выяўлена. (Заўважым, што Мікалай Гайба выдаў кнігу «Могілкі і пахаванні ў Навагрудку». — **Б.П.**)

### Чаму пасля «Пана Тадэвуша» Міцкевіч больш не пісаў вершаў?

— Гэтае пытанне мяне цікавіць нават больш, чым асабістае жыццё Адама Міцкевіча. Чаму паэмай «Пан Тадэвуш», якая была апублікавана ў 1834 годзе, фактычна завяршаецца яго паэтычная творчасць? Хоць пазней ён пісаў вершы, але пры жыцці паэта яны нідзе не друкаваліся.

Тлумачэнняў гэтаму можна знайсці некалькі. Так, былі сямейныя абставіны: выдаў паэму, праз месяц ажаніўся, шасцёра дзяцей, доўгі час жонка хварэла, сям'я перажывала матэрыяльныя нястачы... Але, пэўна, прычына і ў тым, што ён не адчуваў далёка ад Радзімы таго жыцця, пра якое мог бы напісаць. Ён напісаў на французскай мове тры п'есы, але гэта каб пракарміцца, а не для душы. У адным з пісьмаў Міцкевіч заўважыў, што «мне неяк шкада перастаць быць літвінам, ды й не па душы ператварацца ў француза». Літвінам ён застаўся ў сваёй душы і думках да канца жыцця.

А галоўным, на маю думку, было тое, што Міцкевіч прад'яўляў да самога сябе і паэзіі вельмі высокія патрабаванні. Ён пісаў у той час: «...Сапраўдная паэзія нашага часу, можа, яшчэ не нарадзілася. Мне здаецца, што вернуцца тыя часы, калі трэба будзе быць святым, каб быць паэтам». І яшчэ: «Я пераконваюся, што занадта шмат жыў і працаваў толькі дзеля свету, дзеля пустых пахвал і дробных мэт. Я, відаць, ніколі не вазьму ў рукі пяра для забаўкі. Толькі тое варта працы, што можа чалавека выправіць або навучыць мудрасці».



Партрэт А. Міцкевіча з экспазіцыі музея работы Міхаіла Моўчана.



Дом-музей А. Міцкевіча ў Навагрудку

### Ці запатрабаваны сёння музей?

Цяпер у Доме-музеі Адама Міцкевіча дэманструецца выстава работ землякоў паэта, навучэнцаў мастацкага аддзялення Навагрудскай дзіцячай школы мастацтваў — усе іх працы на тэму апетага паэтам возера Свіцязь і легендарнага горада, што там быў. Вялікі гонар для юных аўтараў!

Ды і прафесіяналы лічаць прэстыжным праводзіць у музеі выставы, творчыя сустрэчы, канцэрты. Напрыклад, летась тут выступілі камерныя калектывы Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга.

А што датычыцца экскурсантаў, то ўжо стабільна музей штогод наведвае каля 21-22 тысяч чалавек, у тым ліку — кожны шосты наведнік —з-за мяжы. Экскурсіі праводзяцца на беларускай, рускай, польскай, англійскай і нямецкай мовах.

— Бываюць госці з краін Азіі, Афрыкі, Амерыкі, якія, можа, ніколі пра Міцкевіча і не чулі. А паколькі турызм — гэта адзін з відаў адпачынку, то мы стараемся не «грузіць» чалавека інфармацыяй, а даць «зачэпку», каб у яго засталася нейкая асацыяцыя пры ўзгадванні Адама Міцкевіча. А далей захоча — пойдзе ў бібліятэку і будзе чытаць творы паэта і кнігі пра яго, — зазначае Мікалай Гайба.

Навагрудак і музей Адама Міцкевіча ўключаны ў шэраг турыстычных маршрутаў. Праўда, некаторым экскурсаводам бракуе адпаведных ведаў.

— Бывае, прыслухаешся ў горадзе — і такое глупства гіды расказваюць!.. Напрыклад, чуў асабіста, адзін турыст пытаецца, калі быў разбураны замак. Фашысты, кажа гід, разбурылі. Дык ён жа да Другой сусветнай вайны ўжо 300 гадоў фактычна такім, як сёння, стаяў!.. Падобныя глупствы чуў і ў аповедах некаторых гідаў пра Адама Міцкевіча і наш музей.

— Прачытаюць, Мікалай Паўлавіч, вашу кнігу «Сэрцу мілая Айчына» — будзе менш памылак...

— А магчыма, у нечым папрaвяць і мяне ...

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## Открытое акционерное общество «СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ № 4»

**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ.**

**Собрание состоится 27 марта 2012 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Коммунистическая, 17, актовый зал.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Стройтрест № 4» за 2011 год и задачах по выполнению прогнозных показателей на 2012 год.
2. Отчет Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии о проделанной работе в 2011 году.
3. Утверждение годового баланса, отчета о прибылях и убытках ОАО «Стройтрест № 4» за 2011 год с учетом заключения ревизионной комиссии и аудиторского заключения.
4. О распределении чистой прибыли (покрытии убытков) и выплате дивидендов по результатам деятельности Общества за 2011 год.
5. Утверждение плана распределения чистой прибыли, остающейся в распоряжении предприятия на 2012 год и первый квартал 2013 года. Периодичность выплаты дивидендов за 2012 год.
6. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии ОАО «Стройтрест № 4».
7. О вознаграждении членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии ОАО «Стройтрест № 4».
8. Утверждение изменений и дополнений в Устав ОАО «Стройтрест № 4».
9. Утверждение локальных нормативных актов Общества.
10. О вхождении в холдинг.

Регистрация участников собрания проводится с 14.00 до 14.45 по предъявлении паспорта, а представителей акционеров — по доверенности.

Список акционеров для регистрации участников собрания будет составлен по данным реестра **на 24 февраля 2012 года.**

С материалами собрания можно ознакомиться **с 20 марта 2012 г. с 9.00 до 17.00** в рабочие дни по адресу: г. Минск, ул. Коммунистическая, 17, каб. 302.

**Справки по тел. в г. Минске 334 10 03.**

УНП 100055368 ***Наблюдательный совет***

---

07 марта 2012 года в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «ЭнКоСтрой»

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об участии других обществ.

Собрание будет проходить по адресу: г. Минск, ул. Монтажников, 39, офис 208.

Начало регистрации — 13.00.

УНН 191303197

---

## ПТ ЗАО «Управляющая компания холдинга «БелГАЗавтосервис»

**ИЗВЕЩАЕТ СВОИХ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ 29 марта 2012 года ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Отчет генерального директора о результатах деятельности ПТ ЗАО «Управляющая компания холдинга «БелГАЗавтосервис» за 2011 г.
2. Отчет и заключение ревизора ПТ ЗАО «Управляющая компания холдинга «БелГАЗавтосервис» о результатах деятельности за 2011 год.
3. Об аудите Общества по результатам финансово-хозяйственной деятельности ПТ ЗАО «Управляющая компания холдинга «БелГАЗавтосервис» за 2011 год.
4. Об утверждении годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2011 год.
5. Распределение чистой прибыли за 2011 г.
6. О выплате дивидендов за 2011 г.
7. Об оказании спонсорской (безвозмездной) помощи за 2011 г. и о планируемом размере спонсорской помощи на 2012 г.
8. О порядке распределения чистой прибыли ПТ ЗАО «Управляющая компания холдинга «БелГАЗавтосервис» в 2012 г.
9. Об избрании членов Совета директоров ПТ ЗАО «Управляющая компания холдинга «БелГАЗавтосервис».
10. Об избрании ревизора ПТ ЗАО «Управляющая компания холдинга «БелГАЗавтосервис».

**Место проведения собрания: г. Минск, ул. Бабушкина, 25, к. 318.**

Время начала проведения собрания — **15.00.** Регистрация участников собрания будет проводиться **с 14.00 до 15.00** в день и по месту проведения собрания — по предъявлении документа, удостоверяющего личность, а для представителя акционера — также надлежащим образом оформленную доверенность.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра **на 23 марта 2012 года.**

С информацией, касающейся вопросов, включенных в повестку дня, лица, имеющие право на участие в собрании, могут ознакомиться **27, 28 марта 2012 года с 10.00 до 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 25, к. 316.

УНП 100123046 ***Совет директоров.***

---

**27 марта 2012 года в 14.00** УНП 600068756

**СОСТОИТСЯ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

## ОАО «ЧЕРМЕТРЕМОНТ»,

**место проведения собрания — по месту нахождения Общества: 223017, Минский р-н, п. Гатово, ОАО «Черметремонт», актовый зал.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1) Об итогах деятельности Общества за 2011 год.
2) О работе наблюдательного совета в 2011 году. Оценка деятельности дирекции за 2011 год.
3) О результатах аудиторской проверки. Отчет ревизионной комиссии по результатам финансовой деятельности Общества за 2011 год.
4) Об утверждении годового отчета и бухгалтерского баланса за 2011 год.
5) Об утверждении фактических расходов чистой прибыли по направлениям за 2011 год, утверждение направлений использования чистой прибыли на 2012 год и 1-ый квартал 2013 года.
6) Об определении срока выплаты дивидендов.
7) Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8) Об утверждении условий материального вознаграждения членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
9) О наделении наблюдательного совета полномочиями принимать решения по вопросам, отнесенным в соответствии с Уставом Общества к компетенции собрания.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — 16.03.2012. Место и время регистрации участников собрания — в день проведения собрания с 12.00 до 13.50 по месту его проведения.

Просим принять участие в собрании или поручить представлять Ваши интересы на собрании акционеров представителю. При себе иметь документ, удостоверяющий личность, и доверенность (для представителей).

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни (понедельник—пятница) с 8.30 до 17.00, начиная с 19.03.2012 в приемной ОАО «Черметремонт», а в день проведения собрания — с 12.00 до 13.50 по месту его проведения.

***Дирекция*** ***Наблюдательный совет***

---

**К сведению акционеров ОАО «Современные розничные технологии»**

**27 марта 2012 года в 12 часов 00 минут по адресу: г. Минск, ул. Мирошниченко, 3 СОСТОИТСЯ ГОДОВОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «СОВРЕМЕННЫЕ РОЗНИЧНЫЕ ТЕХНОЛОГИИ»**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год и основных направлениях развития Общества в 2012 году.
2. Об утверждении заключения аудиторской проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2011 году, заключения ревизионной комиссии по результатам деятельности Общества в 2011 году.
3. Об утверждении отчета о работе наблюдательного совета Общества в 2011 году.
4. Об утверждении годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2011 год.
5. О распределении чистой прибыли и выплате дивидендов за 2011 год и утверждении направлений использования чистой прибыли на 2012 год и 1 квартал 2013 года.
6. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
7. Об утверждении условий материального вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, будет проводиться по месту проведения собрания с 11 часов 00 минут до 11 часов 45 минут.

Акционер Общества принимает участие в работе собрания лично или через своего представителя, действующего на основании доверенности. Для регистрации на собрании необходимо при себе иметь паспорт и доверенность.

Дата формирования реестра владельцев ценных бумаг, на основании которого составляется список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров Общества, — 01 марта 2012 года.

С материалами, подготовленными к собранию, акционеры могут ознакомиться в рабочие дни с 09 часов 00 минут до 16 часов 00 минут с 20 марта 2012 года по адресу: г. Минск, ул. Мирошниченко, 3, в день проведения собрания — по месту его проведения.

Орган, созывающий общее собрание акционеров ОАО «Современные розничные технологии», — наблюдательный совет.

*УНП 690019195* **Наблюдательный совет (тел. 017 261 00 89).**

---

## Уважаемые акционеры ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат»!

**Во Дворце культуры сахарорафинадного комбината по адресу: г. Слуцк, ул. Головащенко, 6, 28 марта 2012 года в 14.00 СОСТОИТСЯ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОТКРЫТОГО АКЦИОНЕРНОГО ОБЩЕСТВА «Слуцкий сахарорафинадный комбинат».**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Отчет о результатах деятельности Общества за 2011 год и направлениях развития на 2012 г.:
   - Отчет Наблюдательного совета о проделанной работе;
   - Отчет Ревизионной комиссии о результатах проверок финансово-хозяйственной деятельности в 2011 году и заключение по бухгалтерскому балансу и годовому отчету Общества;
   - Отчет Дирекции об итогах финансово-хозяйственной деятельности в 2011 году и основных направлениях развития Общества на 2012 год;
   - Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков за 2011 г. с учетом аудиторского заключения;
   - Утверждение распределения чистой прибыли, остающейся в распоряжении Общества за 2011 г.
2. Утверждение направлений и нормативов распределения чистой прибыли, смет использования чистой прибыли и расходов на потребление на 2012 год и 1 квартал 2013 года (докладчик Дапиро О.И.).
3. Утверждение размера, порядка и сроков выплаты дивидендов за 2011 год, порядка и сроков выплаты дивидендов по 2012 году (докладчик Дапиро О.И.).
4. Утверждение размера, условий вознаграждения и компенсации расходов за исполнение своих обязанностей членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии (докл. Прудник Н.П.).
5. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества (докл. Дапиро О.И.).

Список акционеров для регистрации участников собрания составляется на 01.03.2012 года.

Регистрация акционеров и их представителей будет осуществляться в день проведения собрания с 13.00 до 14.00 по месту его проведения.

Представителям акционеров при регистрации иметь паспорт, доверенность, оформленную в установленном порядке, акционерам — паспорт.

**Информацию (материалы) по вопросам повестки дня можно получить:**

- в рабочие дни с 8.00 до 17.00 по месту нахождения Общества, начиная с 21 по 28 марта 2012 года (тел. 4 53 28);
- в день проведения собрания — по месту его проведения.

*Дирекция, Наблюдательный совет*
*ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат».* УНН 600075003

---

## УЗДЕНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**29 марта 2012 года по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет 309 (3-й этаж) в 10.00 проводит открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков, в 11.00 – открытый аукцион по продаже в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

На аукционные торги на право заключения договоров аренды выставляются следующие участки с начальной ценой:

| № лота | Продавец | Местонахождение участка | S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (бел. руб.) | Расходы по подготовке (кроме расходов на публикацию извещения) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Узденский райисполком | Земельный участок: г. Узда – ул. Новицкого, участок № 3 | 0,1389 | 625650100001000514 | 37 226 840 | 1 386 462 |
| Лот № 2 | Узденский райисполком | Земельный участок: г. Узда – ул. Колхозная | 0,0150 | 625650100005000430 | 1 089 500 | 1 635 337 |

Целевое назначение участка по улице Колхозная – для установки и обслуживания торгового павильона, по улице Новицкого – для строительства и обслуживания здания магазина. Участки свободны от строений. Инженерные коммуникации: по улице Новицкого – имеется возможность подведения к газоснабжению, водоснабжению, водоотведению. Срок аренды участков – 25 лет.

На аукционные торги по продаже в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов выставляются следующие участки с начальной ценой:

| № лота | Продавец | Местонахождение участка | S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (бел. руб.) | Расходы по подготовке (кроме расходов на публикацию извещения) (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | агрогородок Озеро Озерский с/Совет | д. Сороковщина, ул. Радужная, уч. № 8 | 0,2500 | 625682510101000053 | 53 000 000 | 84 000 |
| Лот № 2 | Лошанский с/Совет | д. Кривели, ул. Школьная, уч. № 3 | 0,1525 | 625681308601000071 | 40 000 000 | 1 928 230 |
| Лот № 3 | Лошанский с/Совет | д. Кривели, ул. Школьная, уч. № 5 | 0,1537 | 625681308601000072 | 40 000 000 | 1 894 240 |
| Лот № 4 | Лошанский с/Совет | д. Кривели, ул. Школьная, уч. № 7 | 0,1525 | 625681308601000073 | 40 000 000 | 1 894 240 |
| Лот № 5 | Лошанский с/Совет | д. Кривели, ул. Школьная, уч. № 9 | 0,1398 | 625681308601000074 | 35 000 000 | 1 894 240 |
| Лот № 6 | Лошанский с/Совет | д. Кривели, ул. Школьная, уч. № 11 | 0,1418 | 625681308601000075 | 37 000 000 | 1 894 240 |
| Лот № 7 | Лошанский с/Совет | д. Кривели, ул. Школьная, уч. № 13 | 0,1422 | 625681308601000076 | 37 000 000 | 1 894 240 |
| Лот № 8 | агрогородок Озеро Озерский с/Совет | ул. Васильковая, уч. № 11 | 0,1500 | 625682508601000753 | 85 000 000 | 1 114 580 |
| Лот № 9 | агрогородок Озеро Озерский с/Совет | ул. Дружная, уч. № 13 | 0,1500 | 625682508601000755 | 80 000 000 | 1 114 580 |
| Лот № 10 | агрогородок Озеро Озерский с/Совет | ул. Дружная, уч. № 18 | 0,1500 | 625682508601000757 | 80 000 000 | 1 114 580 |
| Лот № 11 | агрогородок Озеро Озерский с/Совет | ул. Березовая, уч. № 20 | 0,1500 | 625682508601000754 | 80 000 000 | 1 114 580 |
| Лот № 12 | агрогородок Озеро Озерский с/Совет | ул. Дружная, уч. №24 | 0,1500 | 625682508601000756 | 80 000 000 | 1 114 580 |
| Лот № 13 | Дещенский с/Совет | д. Рябиновка, ул. Рябиновая, уч. № 7 | 0,1500 | 625680211801000066 | 15 000 000 | 1 583 880 |
| Лот № 14 | Дещенский с/Совет | д. Рябиновка, ул. Рябиновая, уч. № 8 | 0,1499 | 625680211801000067 | 15 000 000 | 1 542 550 |
| Лот № 15 | Дещенский с/Совет | д. Рябиновка, ул. Рябиновая, уч. № 18 | 0,1409 | 625680211801000068 | 14 500 000 | 1 542 550 |
| Лот № 16 | Дещенский с/Совет | д. Рябиновка, ул. Рябиновая, уч. № 20 | 0,1408 | 625680211801000069 | 14 500 000 | 1 542 550 |
| Лот № 17 | Дещенский с/Совет | д. Рябиновка, ул. Рябиновая, уч. № 26 | 0,1501 | 625680211801000070 | 15 000 000 | 1 542 550 |
| Лот № 18 | Дещенский с/Совет | д. Рябиновка, ул. Рябиновая, уч. № 28 | 0,1500 | 625680211801000071 | 15 000 000 | 1 542 550 |

Целевое назначение участков – для строительства и обслуживания жилых домов.

К участкам в агрогородке Озеро имеется возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению и водоснабжению. К участку, расположенному по адресу: д. Сороковщина Озерского сельского Совета, имеется возможность подключения к газоснабжению и водоснабжению.

Участки в д. Кривели находятся в живописном месте рядом с Лошанским водохранилищем, имеется возможность подключения к водоснабжению.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет 3602631002502 финансового отдела Узденского райисполкома в филиале 606 ОАО «Беларусбанк» г. Дзержинска, МФО 153001514, УНП 600203994, код платежа на право заключения договоров аренды 04002, код платежа по продаже земельных участков в частную собственность 04901. Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой.

**Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, второй этаж, кабинет 210, с 8.00 до 17.00 по рабочим дням с 27 февраля по 23 марта 2012 года включительно.**

Заключительная регистрация – с 8.30 до 9.55 в день проведения аукциона.

Участники аукциона должны представить следующие документы:

- заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;
- заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц представляют документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукциона и подготовке документации для его проведения.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе, путем выезда к месту нахождения этих участков.

**Более подробная информация об аукционах, условиях участия размещена на официальном сайте Узденского районного исполнительного комитета: www.uzda.minsk-region.by, либо по телефонам: (801718) 55404, 54705, 55342.**

---

06 марта 2012 г. в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Брестский КСМ».

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Брестский КСМ»: г. Брест, ул. Московская, 360.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Московская, 360.

Время регистрации в день проведения собрания с 13.30 до 14.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 29.02.2012 г. (с 10.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

УНП 200295903 Совет директоров.

---

## ОАО «РИП-АЧФА»

**приглашает на очередное общее собрание акционеров, которое состоится 27 марта 2012 года в 11.00 по адресу: г. Минск, пр. Партизанский, 146а.**

**В повестку дня включены следующие вопросы:**

1. Утверждение годового отчета.
2. Выборы членов Наблюдательного совета.
3. Выборы ревизора.

УНП 101030607

---

**Считать недействительными** квитанции о приеме наличных денежных средств формы 1-СУ серии КС №№ 0876608, 0876611, 0021964; страховые свидетельства по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВС № 7294667 СООО «Белкоопстрах» ф-ла в г. Могилеве. УНП 700187331

---

*Уважаемые акционеры!*

## ОАО «ДРЕВСТРОЙ»

**ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ОБЩЕСТВА В ОЧНОЙ ФОРМЕ, которое состоится 28 марта 2012 г. по адресу: г. Минск, ул. Брестская, 2, комната 1 в 18.00. Регистрация участвующих в собрании с 17.30 до 18.00 по месту проведения собрания.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2011 году и основных направлениях деятельности на 2012 год.
2. Об утверждении годового отчета финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Древстрой», бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков за 2011 год и о результатах аудиторской проверки.
3. Утверждение направлений использования чистой прибыли Общества на 2012 год. О выплате дивидендов за 2011 год.
4. Утверждение новой редакции Устава ОАО «Древстрой», приведенной в соответствие с Законом «Об обществах».
5. О выкупе акций.
6. Избрание председателя, членов наблюдательного совета и ревизора Общества.

Для получения дополнительной информации обращаться в ОАО «Древстрой» по адресу: Минская обл., Минский р-н, а/г Ждановичи, ул. Линейная, 3.

**Телефон: 8 029 3876647 (Vel.).** УНП 600013410

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

**Организатор аукциона:** Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42 61 62.

**Продавец:** Республиканское унитарное предприятие почтовой связи «Белпочта», тел. (0212) 53 32 96

| № лота | Предмет аукциона, срок договора аренды, наименование, местонахождение недвижимого имущества. Целевое использование. | Начальная цена, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1. | Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещений площадью 40,2 кв.м, 3,9 кв.м, 18,1 кв.м, расположенных на 1 этаже капитального строения с инв.№ 200/С-52237 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Ленинградская, д. 84А/7, для размещения офисов, производственных целей (за исключением вредных производств) складских помещений, оказания услуг, осуществления торговли. | 544 250 | 54 420 |
| 2. | Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 43,4 кв.м, расположенного на 2 этаже в изолированном помещении с инв. № 200/D-107228 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Чкалова, 34-, для размещения офиса, складского помещения, осуществления розничной торговли, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). | 379 750 | 37 970 |
| 3. | Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 25,55 кв.м, расположенного на 3 этаже капитального строения с инв. № 240/С-18515 по адресу: Витебская область, г. Орша, ул. Ленина, д. 46, для размещения офиса, складского помещения, осуществления розничной торговли, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). | 223 563 | 22 350 |
| Дата, время и место проведения аукциона: 27.03.2012 в 15.00 г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок подачи документов: с 27.02.2012 с 8.30 по 26.03.2012 до 17.30. | | | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1. | Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 13,73 кв.м, расположенного на 1 этаже капитального строения с инв. № 240/С-29422 по адресу: Витебская область, г. Орша, ул. Флерова, д. 6А, для размещения офиса, складского помещения, осуществления розничной торговли, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). | 120 138 | 12 010 |
| 2. | Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 7,63 кв.м, расположенного на 1 этаже капитального строения с инв.№ 240/С-29422 по адресу: Витебская область, г. Орша, ул. Флерова, д. 6А, для размещения офиса, складского помещения, осуществления розничной торговли, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). | 66 763 | 6 670 |
| Дата, время и место проведения аукциона: 28.03.2012 в 15.00 г. Орша, ул. Ленина, 46, здание РУПС. Срок подачи документов: с 27.02.2012 с 8.30. по 27.03.2012 до 17.30. | | | |

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».**

1. Для участия в аукционе приглашаются граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели.

2. Для участия в аукционе в адрес организатора аукциона необходимо представить:

- заявление на участие в аукционе, подписать соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведении аукциона;
- копию платежного документа о внесении задатка на р/с организатора аукциона, заверенную банком;
- юридическому лицу – резиденту Республики Беларусь: копию документа, подтверждающую государственную регистрацию юридического лица; копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;
- юридическому лицу – нерезиденту Республики Беларусь: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;
- индивидуальному предпринимателю: копию документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;
- предъявить: представителем индивидуального предпринимателя, юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность.

3. Победителем аукциона будет признано лицо, предложившее наиболее высокую цену. Лицам, не выигравшим торги, задаток возвращается.

4. Продавец по результатам проведения аукциона заключает с победителем аукциона (лицом, приравненным к Победителю аукциона) договор аренды здания в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) приобретает право заключения договора аренды после оплаты стоимости предмета аукциона и возмещения затрат на организацию и проведение аукциона. Цена продажи предмета аукциона не засчитывается в арендную плату, подлежащую уплате в соответствии с законодательством.

5. Победитель аукциона (лицо, приравненное к Победителю аукциона) обязан оплатить предмет аукциона, затраты на организацию и проведение аукциона в течение трех рабочих дней со дня проведения аукциона в порядке и размере, указанном в протоколе аукциона.

6. Сумма задатка перечисляется на р/с организатора аукциона: № 3012218220012 в Головном филиале по Витебской области ОАО «Белинвестбанк» г. Витебск, ул. Ленина, 22/16, МФО 701, УНП 390477566 (в бел.руб.); № 3012000009469 (в дол. США) в ф-ле № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Витебск, ул. Гоголя, 8, МФО 150801259, УНП 390477566. При перечислении денежных средств в иностранной валюте расходы по продаже валюты (перевод в белорусские рубли) возмещаются Победителем.

7. Контактные тел.: (0212) 42 61 62, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by

---

## ОАО «СТРОЙТРЕСТ № 35»

**сообщает, что 29 марта 2012 года в 15.00 СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ в актовом зале по адресу: г. Минск, ул. Я. Коласа, д. 38.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2011 г. и основные направления деятельности на 2012 год.
2. Отчет наблюдательного совета Общества за 2011 год.
3. Отчет ревизионной комиссии Общества за 2011 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибыли и убытках Общества за 2011 год с учетом заключения ревизионной комиссии, результатов аудиторской проверки финансово-хозяйственной деятельности за 2011 год.
5. О распределении чистой прибыли и выплате дивидендов по результатам деятельности Общества за 2011 год.
6. Утверждение направлений использования чистой прибыли в 2012 году и 1 квартале 2013 г.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. Утверждение размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
9. О внесении изменений в Устав Общества.
10. Об утверждении локальных нормативных актов Общества.
11. О вхождении в холдинг.

С материалами по повестке дня можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Я. Коласа, 38 (приемная ОАО «Стройтрест № 35», 3-й этаж) с 21 по 23 и с 26 по 28 марта 2012 года с 9.00 до 17.00 с перерывом с 13.00 до 14.00, 29 марта 2012 года с 9.00 до 13.00.

Регистрация участников собрания будет производиться 29.03.2012 с 14.00 до 15.00 по месту проведения собрания.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность. УНП 100289278

---

## Уважаемые акционеры ОАО «Ресторан «Беларус»!

**26.03.2012 года СОСТОИТСЯ ОБЩЕЕ ГОДОВОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «Ресторан «Беларус» (г. Минск, ул. Сторожевская, 15 А, тел. 293 17 17)**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2011 г. и основных направлениях развития Общества на 2012 г.
2. О работе Наблюдательного совета в 2011 г.
3. О результатах аудиторской проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества и работе ревизионной комиссии в 2011 г .
4. Утверждение годового отчета и бухгалтерского баланса за 2011 г.
5. Утверждение распределения чистой прибыли за 2011 г. О выплате дивидендов за 2011 г.
6. О направлениях использования чистой прибыли в 2012 г. и в 1 квартале 2013 года.
7. Избрание членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. О вознаграждении членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Сторожевская, 15 А, с 16 марта по 23 марта 2012 года (время работы с 9.00 до 17.00) либо 26 марта 2012 года по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания с 13.00 до 15.00 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания – 26 марта 2012 года, 15.00.

Список лиц, имеющих права на участие в собрании акционеров, будет составлен на основании реестра акционеров, сформированного на 26 февраля 2012 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:
акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 100055804

---

**Внеочередное общее собрание акционеров**

## открытого акционерного общества «МОТОВЕЛО»

**(г. Минск, проспект Партизанский, 8) состоится 2 марта 2012 г. по адресу: г. Минск, проспект Партизанский, 8 в заочной форме**

Орган, по решению которого созывается общее собрание акционеров: Наблюдательный совет ОАО «МОТОВЕЛО».

УНП 190017558

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об увеличении уставного фонда ОАО «МОТОВЕЛО» путем увеличения номинальной стоимости простой (обыкновенной) акции ОАО «МОТОВЕЛО» за счет источников собственных средств ОАО «МОТОВЕЛО».

Бюллетени для заочного голосования акционеры получают с 27 по 28 февраля 2012 г. по адресу: г. Минск, проспект Партизанский, 8, комн. 2 с 9.00 до 17.00 (обеденный перерыв с 13.00 до 14.00), под роспись при предъявлении паспорта (для представителей акционеров — паспорта и доверенности).

Акционеры обязаны возвратить заполненные бюллетени для заочного голосования по указанному адресу не позднее 17.00 28 февраля 2012 г.

С проектом решений собрания, изменения в устав ОАО «МОТОВЕЛО», формой и текстом бюллетеня для заочного голосования акционеры могут ознакомиться с 27 по 28 февраля 2012 г. по адресу: г. Минск, проспект Партизанский, 8, комн. 2 с 9.00 до 17.00 (обеденный перерыв с 13.00 до 14.00).

Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, составлен на основании данных реестра владельцев акций ОАО «МОТОВЕЛО» по состоянию на 24 февраля 2012 г.

**ТРЫ НАТАЛЛІ, У ПАРАДНАЙ ФОРМЕ З ЖЭЗЛАМІ Ў РУКАХ, ВЫКАНАЛІ ТАНЕЦ РЭГУЛІРОЎШЧЫЦ, ЯКІ І СТАЎ ГАЛОЎНЫМ СЮРПРЫЗАМ НАЧНОГА ШОУ АД АЎТАІНСПЕКЦЫІ.**

# РАДАР

ВЫПУСК № 2 (30)

Спецпраект газеты «Звязда» і Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі МУС Рэспублікі Беларусь




**ЧАС ПАКАЗВАЕ, ШТО КАЛІ «ЗАПАХНЕ» ВЯСНОЮ... ДАРОЖНАЕ ПАКРЫЦЦЁ ВЫЗВАЛІЦЦА АД СНЕЖНАГА ПОКРЫВА, ТО МНОГІЯ ЛЮДЗІ, ЯКІЯ З-ЗА ЭКАНОМІІ ЦІ НЕ ЗУСІМ НАЛЕЖНАГА ТЭХНІЧНАГА СТАНУ АЎТАМАБІЛЯ ПРОСТА НЕ ЕЗДЗІЛІ, АДЧУЮЦЬ СЯБЕ «ШУМАХЕРАМІ» І ПАМЧАЦЦА ПАВЫШАЦЬ СВОЙ ПРАФЕСІЙНЫ ЎЗРОВЕНЬ.**

АНАЛІТЫКА

## Аўтамабільны рынак Беларусі: быць ці не быць?

**Сёння відавочна, што аўтамабільны рынак Беларусі застыў. Новаўвядзенні ў айчынным заканадаўстве аб умовах продажу новых аўтамабіляў у аўтасалонах (праз якія цана на транспартныя сродкі вырасла) і ўвядзенне з 1 ліпеня мінулага года высокай аўтамабільнай пошліны на «растаможку» патрыманых і новых аўто ў многім гэтаму паспрыялі. Аднак, на думку спецыялістаў, такая сітуацыя — часовая. Глядзіш, з наступленнем вясны актыўнасць прадаўцоў і пакупнікоў вырасце, і мінулагоднія «запасы» прыйдзецца папаўняць, але ў новых эканамічных і заканадаўчых умовах.**

Аптымізм не губляе і міжнародны аўтамабільны холдынг «Атлант-М». Кампанія падвяла вынікі за 2011 год: продаж легкавых аўтамабіляў прыкметна вырас — да ўзроўню 13436 машын. Між іншым, пакупніцкі інтарэс пачаў схіляцца ў бок імпартных аўтамабільных брэндаў: продаж расійскіх аўтамабіляў значна знізіўся (на 33%). Сярод замежных марак самымі папулярнымі былі «Аўдзі» (5,37% рынку), «Форд» (5,41%), «Рэно» (8,05%). Пацвердзіў сваё званне «народнага аўтамабіля» Volkswagen. У яго ў 2011 годзе была самая вялікая доля рынку — 15,37%. За гэтымі працэнтамі — 2502 аўтамабілі, сярод якіх мадэлі не толькі з легкавога сегменту, але і з камерцыйнага. Сярод лідараў продажаў легкавых машын — «Polo седан», пазадарожнік «Touareg», «Passat», хэтчбэк «Golf» і «Tiguan».

На фоне такіх вынікаў холдынг спадзяецца на тое, што аўтамабільны рынак у Беларусі яшчэ ажыве.

**Уладзіслаў СОЎПЕЛЬ.**

Васіль БУЛЬБЯНКОЎ, намеснік начальніка УДАІ МУС Рэспублікі Беларусь, палкоўнік міліцыі:

# «ПАВЫШАНАЯ ЎВАГА НА ДАРОЗЕ НЕ ПАШКОДЗІЦЬ КОЖНАМУ ВАДЗІЦЕЛЮ Ў ЛЮБУЮ ПАРУ ГОДА»

**КАНЕЦ зімы для шматлікай арміі аўтамабілістаў, якія паркавалі сваё аўто падчас моцных маразоў і снегападаў у гаражы ці ў двары дома на месяц-другі, звычайна звязаны з актывізацыяй «прафесійнай» дзейнасці. Глядзіш, напярэдадні вясны дарогі напоўняцца «адпачыўшымі» транспартнымі сродкамі, за рулём якіх будуць знаходзіцца людзі, якія за час зімовай «спячкі» маглі страціць вадзіцельскія навыкі. Пэўна, што ў такі пераходны перыяд адпаведна павінны ацэньваць сітуацыю супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі. Магчыма, што такая асцярога не мае пад сабой падстаў і прафесіянальным аўтамабілістам, якія знаходзяцца «за баранкай» круглы год, няма чаго хваляваца.**

**Карэспандэнт «Звязды» гэтае і многія пытанні абмяркоўвае з намеснікам начальніка УДАІ МУС Рэспублікі Беларусь, палкоўнікам міліцыі Васілём БУЛЬБЯНКОВЫМ.**



**Навыкі ваджэння да вас абавязкова вернуцца, і вы зноў будзеце адчуваць сябе ўпэўнена за рулём. Але ж пастарайцеся вярнуцца да актыўнага «драйву» ў выхадны дзень ці па маршруце, дзе інтэнсіўнасць руху значна меншая, чым на ажыўленых трасах.**

**— Васіль Васільевіч, скажыце, як прафесіянал са стажам, ці варта зараз хвалявацца наконт таго, што інтэнсіўнасць дарожнага руху павысіцца на парадак — а гэта значна ўскладніць дарожную сітуацыю? Больш за тое, на праезнай частцы з'явяцца вадзіцелі, якія некалькі месяцаў не садзіліся за руль?**

— Ведаеце, павышаная ўвага на дарозе не пашкодзіць кожнаму вадзіцелю ў любую пару года. А зараз — асабліва. Час паказвае, што калі «запахне» вясною, па дарозе пабягуць ручаі, дарожнае пакрыццё вызваліцца ад снежнага покрыва, то многія людзі, якія з-за эканоміі ці не зусім належнага тэхнічнага стану аўтамабіля проста не ездзілі, адчуюць сябе «шумахерамі» і памчацца павышаць свой прафесійны ўзровень. З гэтай нагоды хацелася б адразу параіць такой катэгорыі вадзіцеляў: будзьце надзвычай асцярожнымі! Навыкі ваджэння да вас абавязкова вернуцца, і вы зноў будзеце адчуваць сябе ўпэўнена за рулём. Але ж пастарайцеся вярнуцца да актыўнага «драйву» ў выхадны дзень ці па маршруце, дзе інтэнсіўнасць руху значна меншая, чым на ажыўленых трасах.

**— Відавочна, што ў якасці каштоўнай парады можна сказаць і пра адпаведную падрыхтоўку аўтамабіля да эксплуатацыі ў новых умовах.**

— А гэта ўжо не столькі парада, колькі патрабаванне. У абавязковым парадку неабходна праверыць узровень масла, спраўнасць педаляў газу-тормазу-счаплення, даліць ці замяніць вадкасць для абмывання шкла, ацаніць работу дворнікаў лабавога шкла. І яшчэ ні ў якім разе не варта адпраўляцца ў дарогу, калі вы не «пераабулі» сваё аўто на зімовыя шыны восенню. Надвор'е пакуль вельмі зменлівае. Ноччу марозіць, днём адпускае. У выніку праезная частка можа быць слізкай. У такім выпадку вы на летняй гуме не толькі ставіце пад пагрозу сваё жыццё, але і бяспеку іншых вадзіцеляў, і асабліва пешаходаў.

**— Па зводках ДАІ, сітуацыя на дарогах апошнім часам стабілізавалася, бо колькасць дарожна-транспартных здарэнняў зменшылася...**

— Як гаворыцца, дзякуй богу, што яно так адбылося. Хоць будзем шчырымі: змяншэнне аварыйнасці на дарогах краіны адбылося дзякуючы моцным маразам — у такі час аўтамабільны паток рэзка зніжаецца. Ну, і вядома ж, нельга абмінуць эфектыўную і плённую работу супрацоўнікаў Дзяржаўтаінспекцыі, якія неслі і сумленна нясуць службу на варце парадку на дарогах, пад'язных шляхах круглыя суткі. Згадзімся, што ад прафесійных дзеянняў супрацоўнікаў ДАІ ў многім залежыць наша з вамі бяспека.

**— Васіль Васільевіч, нават пры такой аптымістычнай карціне дарожная статыстыка ўсё роўна штодня напоўнена здарэннямі, якія адбываюцца як па віне вадзіцеляў, так і па віне пешаходаў.**

— Як ні сумна канстатаваць, але гэта так. А інакш наўрад ці можа быць. Бо нават не абавязкова ведаць дасканала тэорыю верагоднасці, каб меркаваць аб прапіснай ісціне: калі ёсць удзельнікі дарожнага руху (толькі колькасць аўтамабілістаў у апошнія гады павялічылася ў разы), то будуць і дарожныя здарэнні. А чаму яны адбываюцца? Тут ужо можна спасылацца і на чалавечы фактар, і на ўмовы надвор'я, і на дарожнае пакрыццё. Прычын — дзясяткі. Але ж вынік, на жаль, адзін — згубленыя і пакалечаныя чалавечыя жыцці. З гэтай нагоды прывяду пэўныя лічбы. На тэрыторыі Беларусі на мінулы месяц супрацоўнікамі ДАІ зафіксавана амаль 9,5 тысячы ДТЗ, у якіх пацярпела 465 чалавек. У гэтым спісе, на жаль, ёсць і тыя, каму прыйшлося развітацца з жыццём. Нягледзячы на пастаянныя настаўленні і рэкамендацыі дзяржаўтаінспектараў у адносінах да пешаходаў аб павышанай увазе на дарогах, за студзень 2012 года зарэгістравана 190 дарожна-транспартных здарэнняў з удзелам пешаходаў. Зразумела, што пешаходы — менш абароненая катэгорыя ўдзельнікаў дарожнага руху, таму даволі часта наезды на іх заканчваюцца трагічна. Таму мне яшчэ і яшчэ раз хацелася б пажадаць усім удзельнікам дарожнага руху павышанай увагі за рулём і на праезнай частцы, павагі адно да аднаго. І я асабіста, і мае калегі заўсёды не перастаюць нагадваць усім аб чарговай прапіснай ісціне: «Паважаныя вадзіцелі і пешаходы, вашы здароўе і бяспека — у вашых руках».

**— Васіль Васільевіч, пачатак вясны, які ўжо не за гарамі, у супрацоўнікаў правапарадку традыцыйна звязаны з прафесійным святам — Днём беларускай міліцыі...**

— Намёк ваш зразумеў. Карыстаючыся выпадкам мне хочацца праз вашу газету пажадаць усім супрацоўнікам органаў правапарадку, а работнікам ДАІ асабліва, плённай службы, добрага здароўя, жыццёвага аптымізму, дабрабыту ў сям'і. Гэтае пажаданне асабліва тычыцца нашых ветэранаў. Адным словам, усяго самага найлепшага. Няхай беражэ вас лёс!

**Гутарыў Уладзімір ЗДАНОВІЧ.**

СПЕЦПАДРАЗДЗЯЛЕННЕ

## «Стралу» — з днём нараджэння!



**Спецыяльнае падраздзяленне ДПС «Страла» 27 лютага адзначае свой дзень нараджэння. Яно было створана ў 1993 годзе і першапачаткова прызначалася для суправаджэння і эскартавання кіраўнікоў дэлегацый замежных краін.**

З часам функцыі «Стралы» значна пашырыліся, і цяпер гэта ўзорнае падраздзяленне ДАІ. Сваю сённяшнюю назву падраздзяленне атрымала ў 2001 годзе. «Страла» пачыналася з суправаджэнняў на аўтамабілях ВАЗ-2109 і матацыклах «Урал ІМЗ-67-36». Зараз эскартаванне ажыццяўляецца на матацыклах «Yamaha FJR1300ABS», а суправаджэнне — на магутных і хуткасных «Крайслер 300С» і «Опель-Вектра С». За гэты час «Страла» правяла больш за 11 тысяч суправаджэнняў і больш за 50 эскартаванняў.

— Сёння абавязкі «Стралы» не абмяжоўваюцца суправаджэннем замежных дэлегацый, — расказвае **начальнік спецпадраздзялення падпалкоўнік міліцыі Артур АЛЕКСАНДРОВІЧ.** — Падраздзяленне займаецца забеспячэннем бяспечнага і беспераашкоднага праезду кіраўніка дзяржавы, а таксама выяўленнем правапарушальнікаў на дарогах. Толькі ў адрозненне ад іншых падраздзяленняў ДАІ, мы не абмежаваны ў тэрыторыі і працуем па ўсёй рэспубліцы.

«Страла» заўсёды першай апрабоўвала новыя тэхнічныя сродкі, у тым ліку сродкі відэа- і фотафіксацыі, новыя сістэмы кантролю за станам дарожнага палатна, за станам надвор'я.

— У нашай дзяжурнай часці ўсталявана спецыяльнае праграмнае забеспячэнне, якое дазваляе быць на сувязі з цэнтрамі кантролю за надвор'ем ва ўсіх рэгіёнах. У рэжыме ан-лайн мы бачым надвор'е, і адпаведна, стан дарог у любым месцы краіны, — расказвае Артур Александровіч. — Калі адбываецца рэзкае пагаршэнне надвор'я (моцны снегапад, галалёдзіца або рэзкае зніжэнне тэмпературы), мы каректуем працу тэрытарыяльных падраздзяленняў, накіроўваем нарады ў месцы, дзе на дарогах узнікаюць ускладненні.

**З ПРАФЕСІЙНЫМІ СВЯТАМІ!**

**Віншую ўсіх супрацоўнікаў і ветэранаў спецпадраздзялення ДПС «Страла» з днём стварэння падраздзялення і Днём беларускай міліцыі! Ад усёй душы жадаю вам моцнага здароўя, сямейнага дабрабыту, невычэрпнага аптымізму і настойлівасці ў дасягненні пастаўленых мэт.**

**Падпалкоўнік міліцыі Артур АЛЕКСАНДРОВІЧ.**

Апрабоўваліся ў «Страле» і ўсе тэхнічныя сродкі, якімі зараз карыстаюцца ў ДАІ, — «Арэна», «Візір», «Кулон». Пра тэхнічнае аснашчэнне элітнага падраздзялення расказвае намеснік **начальніка па тэхнічнай частцы Мікалай ІГНАТОВІЧ:**

— Уцячы ад нашых машын немагчыма: зусім нядаўна быў выпадак, калі парушальнік імкнуўся з'ехаць на «Поршэ Каен». Хуткасць была пад 200 км/г, аднак наш экіпаж яго дагнаў... У нас на ўзбраенні даволі сучасныя прыборы для вымярэння хуткасці руху — мабільныя «Візір» і стацыянарны «Арэна». Ёсць прыборы, якія дазваляюць вызначыць нумар кузава без зняцця лакафарбавага пакрыцця. Гэта магнітааптычны прыбор «Зоркі». Ён дапамагае адразу на лініі вызначыць, «перабіты» кузаў ці не. Кішэнна-прамысловы камп'ютар «Кулон» дазваляе атрымаць поўную інфармацыю пра асобу — ад пашпартных даных да таго, ці знаходзіцца асоба або аўтамабіль у вышуку. Апаратна-праграмны комплекс «Аўтаўраган» дазваляе выявіць з агульнай плыні аўтамабіль, які знаходзіцца ў вышуку. Ён скануе нумары і звярае па базе звестак. Калі кіроўца на гэтым аўтамабілі пазбаўлены пасведчання за язду ў п'яным выглядзе, яго таксама спыняюць нашы супрацоўнікі. Аднойчы за дзень тры нашы экіпажы спынілі ў Мінску 36 аўтамабіляў, кіроўцы якіх селі за руль без правоў. Згодна са статыстыкай, кожны 10-ты кіроўца, які аднойчы папаўся за рулём п'яным, на працягу года зноў садзіцца за руль у стане алкагольнага ап'янення. І выяўляць такіх парушальнікаў вельмі важна.

Апошнім часам мы атрымалі на ўзбраенне відэарэгістратары. Імі зараз карыстаюцца і звычайныя аўтааматары. Толькі нашы відэарэгістратары двухкамерныя: адна камера здымае тое, што робіцца за лабавым шклом, другая — у салоне. Відэарэгістратар не дазваляе развіцца канфлікту паміж аўтаўладальнікам і інспектарам. Вельмі часта здараецца, калі парушальнік просіць інспектара аформіць пратакол па больш «мяккім» артыкуле і пагражае ў адваротным выпадку напісаць скаргу, быццам бы той вымагаў хабар. Цяпер кіроўца будзе папярэджаны, што ўсе яго дзеянні запісваюцца на відэакамеру, і наўрад ці будзе прапаноўваць грошы ці шантажыраваць супрацоўніка ДАІ.

# ЛЮБІ ЖЫЦЦЁ! або Рэгуліроўшчыцы ў танцы

**НА прэс-канферэнцыі па выніках мінулага года, якую правёў для прадстаўнікоў СМІ часова выконваючы абавязкі начальніка Брэсцкай дзяржаўтаінспекцыі Уладзіслаў КРАЦ, была агучана трывожная статыстыка. За дванаццаць месяцаў мінулага года на дарогах вобласці зарэгістравана 824 дарожна-транспартныя здарэнні. Колькасць загінулых пры аварыях вырасла ў параўнанні з папярэднім годам больш як на 13%.**

Асноўнымі прычынамі надзвычайных здарэнняў на дарозе названы няправільны хуткасны рэжым, парушэнне правілаў абгону і выезд на паласу сустрэчнага руху, парушэнне правілаў праезду скрыжаванняў і пешаходных пераходаў. У цэлым больш за 80% дарожных здарэнняў здзейснена па віне кіроўцаў і каля 20% — на сумленні пешаходаў. На працягу года затрыманы 8603 п'яныя вадзіцелі. Дарэчы, адзначаецца павелічэнне колькасці нецвярозых жанчын за рулём.

Цікавую статыстыку прыводзілі міліцыянеры ў кантэксце размовы пра час дарожных здарэнняў. Аказалася, што найбольшая іх колькасць адбываецца ў суботу і нядзелю з 16 да 20 гадзін на дарогах рэспубліканскага значэння. У гэтыя ж дні найчасцей гінуць людзі, але час ужо іншы — з 20 да 24.

Асаблівую трывогу выклікаюць у супрацоўнікаў ДАІ паводзіны кіроўцаў, якія не маюць права на кіраванне аўтамабілем. Адны з іх пазбаўлены пасведчання, іншыя яго наогул яшчэ не атрымалі. Часцей за ўсё гэта маладыя людзі ва ўзросце ад 18 да 23 гадоў. Па іх віне адбылося 146 аварый, у якіх 34 чалавекі загінулі. Узрасла і колькасць здарэнняў з удзелам вадзіцеляў, што маюць невялікі стаж кіравання.

— Работу з маладымі вадзіцелямі ў Брэсцкай дзяржаўтаінспекцыі разглядаюць як адзін з асноўных кірункаў прафілактыкі дарожна-транспартных здарэнняў, — адзначыла начальнік аддзела прапаганды і агітацыі Наталля САХАРЧУК. — Нашы супрацоўнікі пастаянна прысутнічаюць на здачы экзаменаў у аўташколах. Мы рыхтуем спецыяльныя памяткі для пачаткоўцаў, дзе яшчэ раз нагадваем, як сябе паводзіць у канкрэтнай дарожнай сітуацыі.

Яшчэ маёр Сахарчук нагадала, што іх аддзел значную ўвагу надае нетрадыцыйным формам агітацыі за бяспечны рух. Паводле яе меркавання, больш чым гутарка, выступленне, нават лекцыя чалавека ў форме ў свядомасці пакідае след яркая эмацыйная карцінка. На гэта і робяць стаўку спецыялісты ў стасунках з моладдзю. У мінулыя гады па гарадах і райцэнтрах вобласці праводзілі дыскатуры пад умоўнай назвай «Жыві па правілах». Там сацыяльныя ролікі паказвалі на дыскатэках. А днямі пагаварыць на гэтую тэму вырашылі ў брэсцкім начным клубе «Сфера».

Там адбыўся вялікі канцэрт пад дэвізам «Любі жыццё!». Галоўным яго арганізатарам выступіла абласная Дзяржаўтаінспекцыя. На іх заклік адгукнуліся многія вядомыя ў моладзевым асяродку артысты. Напрыклад, ансамбль мажарэтак «Віктары», Алена Надольская, Віталь Пракаповіч, эксперыментальны тэатр «ЭРЭТЭ», а таксама экс-вакаліст групы «Новы Іерусалім» Аляксандр Патліс.

Але і самі арганізатары «запальвалі» на сцэне не горш за артыстаў. Тры сімпатычныя супрацоўніцы ДАІ, тры Наталлі, у парадных форме з жэзламі ў руках выканалі танец рэгуліроўшчыц, які і стаў галоўным сюрпрызам начнога шоу ад аўтаінспекцыі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**



# БУДНІ АДНАГО ЭКІПАЖА

**У дзяжурную часць Гомельскай абласной ДАІ штодня паступае каля паўсотні паведамленняў аб правапарушэннях, здарэннях, злачынствах. Аднойчы было зафіксавана 98 такіх паведамленняў. Жыхары шматпавярховак наракаюць на аўтамабілі, прыпаркаваныя на тратуары, пры гэтым просяць не называць прозвішча заяўніка. Кіроўцы — пра стварэнне аварыйных сітуацый. Пешаходы абураюцца з нагоды праезду аўтамабілістаў на забараняльны сігнал святлафора... Сюды ж сцякаецца інфармацыя пра заторы, дарожныя перашкоды, зламаныя святлафоры, згубленыя нумарныя знакі... Адначасова дзяжурны прымае званкі ад удзельнікаў і відавочцаў ДТЗ. З пачатку года іх паступіла больш за 750. Два дзясяткі — з параненымі і загінулымі людзьмі. Нярэдка здараецца, што на аднаго інспектара ДПС адразу звальваецца некалькі тэрміновых заданняў. І бывае прыкра, калі даводзіцца зрывацца на лжывыя выклікі і ўзаемныя разборкі дарожных аўтахамаў.**

Звычайны дзень у канцы працоўнага тыдня. На дзяжурстве — адзін з экіпажаў батальёна ў складзе двух інспектараў — капітанаў міліцыі Аляксандра К. і Уладзіміра М.

На вуліцы Гомельскай кіроўца «Хонды» прыпаркаваў аўто побач з домам знаёмай. Невядомую легкавушку, якая праязджала міма, занесла на чужы бампер. У выніку — расколіна на машыне і задачка для супрацоўнікаў ДАІ.

На скрыжаванні вуліц Бочкіна—Амурская затрымана 6 аўтамабілістаў без тэхагляду, у тым ліку кіроўца службовай фуры з Магілёўшчыны. Для ДАІ гэтае парушэнне не дробязь: летась эксплуатацыя тэхнічна няспраўных транспартных сродкаў на тэрыторыі вобласці стала прычынай смерці аднаго і ранення семярых людзей.

На мосце ў 5-м мікраёне інспектар прымусіў нервавацца кіроўцу «Фольксвагена»: паведаміў яму, што той ездзіць з пратэрмінаваным пасведчаннем. Няўважліваму аўтамабілісту выпісалі штраф.



Па словах капітана Уладзіміра М., кіроўцы не спрачаюцца з нагоды такіх відавочных, з іх пункту гледжання, парушэнняў, як адсутнасць тэхагляду, страхоўкі, пасведчання. Абураюцца, як правіла, па «буйных» фактах, за якія прадугледжана больш вялікая адказнасць. Сваю віну бурна адмаўляюць і нецвярозыя кіроўцы. Самыя складаныя суразмоўцы — пешаходы, якія парушылі ПДР.

На праспекце Кастрычніка ўрач-хірург, які перайшоў дарогу за метраў пяцьдзясят ад пешаходнага перахода, доўга вымаўляў інспектару за «нялюдскае» стаўленне. Пакуль адзін інспектар угаворваў на тратуары абуранага пешахода, другі выбег з жазлом на праезную частку і спыніў кіроўцу «ВАЗа», які праскочыў на чырвоны сігнал. Пасля падпісання пратакола пешаход дэманстратыўна пляснуў дзвярыма міліцэйскага аўто. Кіроўца ж пакорліва прыняў заслужанае пакаранне. А тым часам наезд на пешахода з'яўляецца самым распаўсюджаным відам ДТЗ. Летась на дарогах Гомельшчыны загінула 56 і паранена 260 пешаходаў. Страшны рахунак адкрыўся і сёлета.

На праспекце Кастрычніка «нагналі» п'янага кіроўцу. Інспектар ДПС Аляксандр К. распавёў, што на вуліцы Валгаградскай кіроўца «Фольксвагена» праігнараваў яго ўказанне спыніцца. Уключыўшы на патрульным аўтамабілі пробліскавыя маячкі, супрацоўнікі накіраваліся за ім. Гоншчыка не спынілі ні міліцэйская сірэна, ні чырвоны сігнал святлафора. У нейкі момант кіроўца не справіўся з машынай і заехаў у сумёт. На шчасце, пацярпеў толькі аўтамабіль парушальніка.

На працягу адной змены інспектары выявілі шэраг іншых парушэнняў, а таксама прынялі ўдзел у правядзенні следчага эксперыменту па факце ДТЗ...

— Наша служба непрадказальная. Яе шмат у чым фарміруюць грамадзяне, якія звяртаюцца па дапамогу ў дзяжурную часць Гомельскай абласной ДАІ, — падагульніў у канцы змены капітан К.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Акцыя



# Бяспека на дарозе пачынаецца з дзяцінства

**ЮНЫЯ знаўцы правілаў дарожнага руху з 23 раёнаў Мінскай вобласці сабраліся на VII абласную алімпіяду па правілах дарожнага руху, якая прайшла ў гэтую пятніцу на базе дзіцячага садка - сярэдняй школы ў вёсцы Бараўляны.**



Спачатку ўдзельнікам мерапрыемства, вучням 5-7 класаў, пажадалі шчаслівых і лёгкіх заданняў арганізатары алімпіяды. Па словах начальніка ўпраўлення ДАІ УУС Мінаблвыканкама Мікалая Караткевіча, сем гадоў таму, калі ў Мінскай вобласці правялі першыя спаборніцтвы па правілах дарожнага руху, быў зроблены правільны выбар. Такое мерапрыемства, як алімпіяда, неабходна праводзіць. Гэта дапаможа захаваць жыццё, весці на дарозе сябе бяспечна.

— Усе ўдзельнікі — ужо пераможцы. У сябе ў рэгіёнах яны ўжо сталі лепшымі, а алімпіяда — гэта магчымасць паказаць свае веды. Тыя, хто з дзяцінства ведае правілы, будзе добрым пешаходам, а пасля — і вадзіцелем, — сказала начальнік аддзела ўпраўлення адукацыі Мінаблвыканкама Тамара Лойка.

Далей школьнікі разышліся па кабінетах, дзе іх чакалі спачатку індывідуальныя заданні па рашэнні білетаў, а пасля — камандны роздум над дарожнай сітуацыяй. З білетамі, на рашэнне якіх адводзілася дзесяць хвілін, дзеці спраўляліся надзіва хутка. Сутнасць другога этапу — па малюнку на маніторы камп'ютара правільна вызначыць, хто з персанажаў сітуацыі з'яўляецца парушальнікам правілаў дарожнага руху, а хто — законапаслухмяны пешаход ці вадзіцель.

Таксама на суд журы дзеці прадставілі відэасюжэты, прысвечаныя бяспечным паводзінам на дарозе, а ў фае школы была арганізавана выстава праектаў «Маршруты бяспекі». Дзеці зрабілі мадэлі сваіх населеных пунктаў з вуліцамі, дарожнымі знакамі і разметкай. Па выніках усіх конкурсаў першае месца ў агульным заліку атрымала каманда юных знаўцаў правілаў дарожнага руху з Барысаўскага раёна, другімі сталі ўдзельнікі з Нясвіжскага раёна, а трэцяй стала каманда Смалявіцкага раёна. Усе пераможцы атрымалі дыпломы і каштоўныя прызы.

**Ганна СЯРГЕЕВА.**

# АДКАЗНЫЯ ЗА САКРЭТНАСЦЬ

**Наталля Санчук і Бранiслава Шабуневіч адпрацавалі ў праваахоўных органах па 30 гадоў. Старшы інспектар па рэжыме сакрэтнасці спецыяльнага падраздзялення ДПС «Страла» МУС Браніслава Шабуневіч пачынала працу ў РУУС Мінскага раёна, адкуль пасля перайшла ў Маскоўскае РУУС. Потым у яе кар'еры было 8 гадоў працы ў дзяржаўным экспертна-крыміналістычным цэнтры МУС. Гэтая праца была самай цікавай, але і нервовай:**



— Было страшна і адказна: нам прыносілі на экспертызу ювелірныя ўпрыгажэнні, грошы, зброю, нават чалавечыя чэрапы. Аднойчы прынеслі адрэзаныя пальцы рук...Часам я баялася ўваходзіць у пакой, дзе захоўваліся «рэчдокі», — узгадвае Браніслава Казіміраўна.

Праца ў спецпадраздзяленні «Страла» не менш адказная: Браніслава Шабуневіч адказвае за апрацоўку ўсіх дакументаў.

Наталля Санчук прыйшла ў органы правапарадку ў васямнаццаць — па жаданні свайго таты. Работа спадабалася, і Наталля Іванаўна засталася. Яе працоўны стаж — 34 гады. Яна пачынала машыністкай-стэнаграфісткай, вырасла да начальніка канцылярыі, затым працавала ў ахове дыпкорпуса. Зараз Наталля Іванаўна — старшы інспектар па рэжыме сакрэтнасці УДАІ МГБ МУС. Яна таксама працуе з дакументамі, большасць з якіх — звароты і скаргі грамадзян.

**Алена КРАВЕЦ**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 30.015. Індэкс 63850. Зак. № 894. Нумар падпісаны ў 19.30 24 лютага 2012 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12